ГОСУДАРСТВЕННОЕ УЧРЕЖДЕНИЕ
"НАЦИОНАЛЬНЫЙ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНЫЙ
МУЗЕЙ-ЗАПОВЕДНИК "НЕСВИЖ"

# АКТУАЛЬНЫЕ ВОПРОСЫ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ И МУЗЕЙНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ







# СБОРНИК

## МАТЕРИАЛОВ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ,

посвященной 440-летию Магдебургского права
и 430-летию Несвижской ратуши

НЕСВИЖ, 31 МАРТА 2026

Министерство культуры Республики Беларусь

Национальный историко-культурный музей-заповедник «Несвиж»

# «Актуальные вопросы историко-культурного наследия и музейной деятельности»

к 440-летию получения Несвижем Магдебургского права и 430-летию Несвижской ратуши

материалы научно-практической конференции

г. Несвиж, 30 марта 2026

ISBN 978-985-7357-02-4

©Национальный историко-культурный музей-заповедник «Несвиж», 2026

УДК
ББК

*Рекомендовано к изданию научно-методическим советом Национального историко-культурного музея-заповедника «Несвиж»*

Составители:

Н.В.Гурина, С.А.Новик, О.В.Шкрабина

**Актуальные вопросы историко-культурного наследия и музейной деятельности** : материалы науч.-практ. конф. (Несвиж, 30 марта 2026 г.) / сост. Н. В. Гурина, С. А. Новик, О. В. Шкрабина. – Несвиж : Национальный историко-культурный музей-заповедник «Несвиж», 2026. - 241 с.: ил.
ISBN 978-985-7357-02-4

В сборнике опубликованы материалы республиканской научно-практической конференции «Актуальные вопросы историко-культурного наследия и музейной деятельности». В первой части в докладах представлены научно-исследовательские работы и аналитические материалы, посвящённые истории ратуш в белорусских городах, а также роли Магдебурского права в развитии городской инфраструктуры и власти. В сборнике представлены исследования, раскрывающие архитектурные особенности ратуш и их функции как центров городской власти, администраций и судопроизводства и влияние Магдебурского права на становление и развитие белорусских городов, а также особенности реализации этого права. Во второй части сборника представлены четыре проекта как результат работы творческой сессии участников конференции.

Этот сборник станет ценным источником для историков, архитекторов и специалистов, интересующихся историей городского самоуправления и культурным наследием Беларуси.

**УДК**
**ББК**

**ISBN 978-985-7357-02-4**

©Национальный историко-культурный музей-заповедник «Несвиж», 2026

# Содержание

1. Доўнар А. Б.
*Магдэбургскае права Нясвіжа: прывілеі, правы, рэалізацыя* 6

2. Белуш Н. С.
*Архитектурные особенности и функции ратуш в белорусских городах* 47

3. Юрасова В. А.
*Ратуша как центр власти: администрация, суд и символика в городах с Магдебургским правом* 55

4. Шишанов В. А.
*Витебский герб на ратуше (к истории бытования символа)* 64

5. Рындин С. Н.
*История Минской городской ратуши (по документам Национального исторического архива Беларуси)* 80

6. Некрашевич А. Т.
*Влияние Магдебургского права на развитие городов Беларуси: исторический опыт города Лиды* 87

7. Віткоўская Т. У., Вішнеўская І. М.
*Ратушы Беларусі як аб’екты ўліку дзяржаўнага інфармацыйнага рэсурсу «Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь»* 108

8. Ожешковская И. Н.
*Ратуша как символ городской идентичности: архитектурное разнообразие городов с Магдебургским правом в Речи Посполитой* 124

9. Есис В. А.
*К вопросу ложных обвинений в «чародействе»: дело Василия Брикуна от 27 февраля 1643 г. из книг полоцкого магистрата* 144

10. Чистяков С.В. 154
*Проблематика идентификации захоронения Николая Христофора Радзивилла Сиротки в крипте Несвижского фарного костёла Божьего Тела*

11. Денисенко Е.Г.
*Дойлід пры двары князя: з Рыма ў Нясвіж* 175

12. Жук Л.М.
*Нясвіжская ратуша і гандлёвая плошча на малюнках і паштоўках пачатку XX стагоддзя ў фондзе музея-запаведніка "Нясвіж"* 183

13. Филимонихин Д.Н.
*Экономическое и социальное развитие городов под влиянием Магдебургского права: торговля, ремёсла, цехи, конфессиональный состав* 190

14. Шкрабина О.В.
*Паспортная система и паспортной режим на белорусских землях в составе Российской империи в конце XIX века (на примере музейной коллекции «Печатные издания, рукописи, фотодокументы, открытки» Национального историко-культурного музея-заповедника «Несвиж»)* 216

Воркшоп «Инклюзивный музей: стратегия работы с разными аудиториями» 227

*Доўнар А.Б.*

# МАГДЭБУРГСКАЕ ПРАВА НЯСВІЖА (ПРЫВІЛЕІ, ПРАВЫ, РЭАЛІЗАЦЫЯ).

Атрыманне самакіравання па магдэбургскаму праву для горада, мястэчка ў часы Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) было знакавай падзеяй. Пры набыцці магдэбургскага права горад атрымоўваў шэраг выгодных праў, свабод і вольнасцяў, якія спрыялі развіццю населенага пункта і яго жыхароў. Разам з тым набытыя вольнасці падразумевалі і шэраг абавязкаў.

Нясвіж у XVI–XVIII стст. быў прыватнаўласніцкім горадам і быў уласнасцю роду Радзівілаў. Нясвіжу з боку яго ўласнікаў надавалася асаблівая ўвага па стварэнню і ўтрыманню найлепшага парадку ў горадзе.

Горад Нясвіж у XVI–XVIII стст. карыстаўся самакіраваннем паводле магдэбургскага права. Ён атрымаў магдэбургскае права па прывілею караля польскага, вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя 1586 г. (было выдадзена некалькі прывілеяў і ўніверсалаў на гэты конт: 23 красавіка, 31 мая і 24 чэрвеня) [2, с. 150; 7, с. 88; 33] (гл. Дадатак). Дадзеныя прывілеі паслужылі прававой асновай функцыянавання органаў гарадскога самакіравання Нясвіжа.

Цікава, што спачатку манарх, кароль польскі вялікі князь літоўскі, Стэфан Баторы не пагаджаўся падпісваць прывілей на магдэбургскае права Нясвіжу. Аб выдачы такога прывілея манарха прасіў уласнік горада Крыштаф Радзівіл Сіротка, а падтрымліваў дадзеную просьбу пры двары манарха, у той час, падканцлер ВКЛ Леў Сапега. Праблема падпісання была ў просьбе вызваліць Нясвіж ад гандлёвых мыт на 20 год… Але «маючы добрае сэрца і добрую волю» да Крыштафа Радзівіла Сіроткі, як пісаў Сапега ў лісце ад 23 красавіка 1586 г., манарх згадзіўся даць вызваленне ад мытных пошлін (мыта) на 10–12 гадоў. А Л. Сапега ў падрыхтаваным прывілеі напісаў «20». Калі прывілей чыталі манарху перад падпісаннем, Стэфан Баторы сваёй

рукой сцёр «20» і напісаў «50», сказаўшы: «калі я згадзіўся да 10, то магу і да 50, але не думаю, што змагу пражыць яшчэ дзесяць гадоў» («siconcessiad 10 possumetad 50 concedere, non putomeenim decemannosvi vere posse») [32, с. 181].

Такім чынам Нясвіж атрымаў прывілей на магдэбургскае права ад 23 красавіка 1586 г. У наступным, Нясвіжам былі атрыманы і іншыя прывілеі, універсалы як у 1586 так і ў наступныя гады:

- 1586.23.04 – прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя гораду Нясвіж на магдэбургскае права і іншыя вольнасці;
- 1586.31.05 – прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя на магдэбургскае права і другія правы г. Нясвіжу;
- 1586.24.06 – прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя Нясвіжу на магдэбургскае права, герб і іншыя вольнасці;
- 1588.28.01 – пацвярджальны прывілей караля польскага, вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы Нясвіжу на магдэбургскае права, герб і іншыя вольнасці;
- 1595.18.03 – універсал караля польскага вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы на пацвярджэнне гораду Нясвіж магдэбургскага права і іншых вольнасцяў;
- 1633.02.03 – пацвярджальны прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Уладзіслава Вазы гораду Нясвіж;
- 1649.04.02 – прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Яна Казіміра г. Нясвіжу на пацвярджэнне магдэбургскага права і іншых праў і вольнасцяў;
- 1669.29.10 – прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Міхала, на пацвярджэнне ўсіх ранейшых прывілеяў Нясвіжа і вызваленне ад мыта на 15 год;
- 1670.01.11 – прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Міхала, пацвярджаючы ўсе ранейшыя прывілеі Нясвіжа і вызваленне на 20 год ад чопавага, мытаў;

- 1676.03.04 – прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Яна Сабескага, пацвярджаючы ўсе ранейшыя прывілеі Нясвіжа і вызваленне ад выплаты чопавага і мытаў;
- 1677.30.02 – прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Яна Сабесскага г. Нясвіжу на пацвярджэнне магдэбургскага права і іншых праў і на вызваленне ад плачэння мытных пошлін (гл. дадатак).

Усе вышэйзгаданыя прывілеі, як і пастановы сойма Рэчы Папалітай 1589, 1595, 1654, 1661, 1670, 1673, 1676, 1677 гг. (гл. Дадатак), фіксавалі на агульнадзяржаўным узроўні прывілеяваны стан Нясвіжа, занатоўвалі яго правы, вольнасці і разам з палітычнай і эканамічнай моцай і уплывовасцю уладальнікаў горада спрыялі яго стабільнаму развіццю.

З наданнем магдэбургскага права гарадское паселішча вылучалася з ранейшай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай сістэмы і ўтварала асобную самастойную адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку са сваімі атрыбутамі – грамадзянствам, інстытутамі ўлады і суда, гербам, падаткавай сістэмай і г. д. Адным з прывабных прынцыпаў магдэбургскага самакіравання ў ВКЛ было тое, што ўлада ў горадзе належала самім мяшчанам: яны на агульных сходах вырашалі найбольш важныя пытанні жыцця горада, выбіралі і кантралявалі органы гарадскога кіравання і суда. Пры гэтым трэба ўлічваць, што вярхоўная ўлада над Нясвіжом заставалася ў яго ўладальнікаў Радзівілаў. У сувязі з чым горад Нясвіж, яго жыхары, цэхі, яўрэі атрымалі на працягу XVI–XVIII стст. шэраг прывілеяў, універсалаў, распараджэнняў ад сваіх уладальнікаў (гл. Дадатак). Напрыклад, уласнікі горада значную ўвагу надавалі рэгуляванню дзейнасці органаў гарадскога самакіравання Нясвіжа: 18 студзеня 1617 г. М.К.Радзівіл выдаў універсал на нясвіжскае войтаўства (гэты ўніверсал згаданы ў рэестры прывілееў горад 1758 года) [29, ark. 143]. 19 студзеня 1731 г.  М. К. Радзівіл выдаў універсал на абранне новага войта Нясвіжа [згад. ў рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 144]. А 14 мая 1737 г. троцкі кашталян, польны гетман ВКЛ М. К. Радзівіл, як уласнік Нясвіжа выдаў універсал нясвіжскаму войту на права суду без апеляцый [25, ark. 145].

Прычым, увага надавалася не толькі дзейнасці войта, але і магістрата Нясвіжа. Так, 2 лістапада 1646 г. Аляксандр Радзівіл выдаў універсал да нясвіжскага магістрату, каб на кіруючыя пасады (лавіцу) не прымалі «ідыётаў» (гэты універсал згаданы ў рэестры прывілееў Нясвіжа 1758 г. [29, ark. 143]).

Значная ўвага ўласнікаў і магістрата Нясвіжа надавалася рэгуляванню і ўладкаванню дзейнасці вытворчых аб'яднанняў горада – цэхаў.Радзівілы зацвярджалі уставы цэхаў:

- 4 сакавіка 1617 г. Ян ЕжыРадзівіл выдаў прывілей на шэўскі цэх у Нясвіжы;
- у 1645 г. муральскі цэх Нясвіжа атрымаў прывілей ад Караля Станіслава Радзівіла;
- 7 жніўня 1666 г. прывілей на нясвіжскі кравецкі цэх выдаў М. К. Радзівіл.
- У 1699 г. прывілей Караля Станіслава Радзівіла атрымаў кушнерскі цэх г. Нясвіжа.

Як і магістрат, як прадстаўнік гарадской улады зацвярджаў уставы гарадскіх цэхаў: 8 сакавіка 1611 г. гэта было зроблена адносна кушнерскага цэха; 14 красавіка 1627 г. – адносна уставы купецкага цэха, а 29 верасня 1641 г. – адносна ўстава, ізноў жа, кушнерскага цэха (дадзеная інфармацыя збераглася ў рэестры прывілеяў Нясвіжа 1758 г. [29, ark. 145].

Дзейнасць магістрата Нясвіжа ахоплівала фактычна ўсе бакі жыцця горада і яго мяшчан. Так, гарадскія ўлады Нясвіжа пастаянна сачылі за станам ратушы, як сімвалам гарадскога самакіравання і месцам працы гарадскіх органаў улады. Напрыклад, каб «мець парадак у ратушы» па распараджэнню войта Себасцьяна Нячая і бурмістра Яна Высоцкага ад 17 жніўня 1651 г. бурмістр Ян Гановіч, павінен быў забяспечыць наяўнасць у ёй скураных вёдраў і бусакоў. Таму Гановіч павінен быў купіць неабходную колькасць жалеза і замовіць у каваля 6 бусакоў. А ў 1652 г. «у ратушы ў сенях перад судовай ізбой упалі на зямлю дзве балкі і паталок увесь згніў і

апаў». У сувязі з чым 17 ліпеня 1652 г. магістратам было дадзена распараджэнне гарадскому бірчаму і будаўнічаму Яну Гановічу наняць раместнікаў, нарыхтаваць балкі, дошкі і палажыць новы пол і паталок, а лішнюю зямлю вынесці [5].

Магістрат Нясвіжа пільна сачыў за станам гарадской маёмасці, так як ад гэтага залежыла яго плацёжаздольнасць як асобнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. Магістрат вёў строгі ўлік маёмасці, складаў рэестры жыхароў і іх нерухомай маёмасці (гарадскіх пляцаў, валок, сенажацяў, дамоў, камяніц, крамаў). Як і магістрат ажыццяўляў улік аб’ектаў падаткаабкладання горада, якія па розных прычынах пераставалі падпарадкоўвацца гарадской юрыздыкцыі. Так, 30 ліпеня 1720 г. быў складзены рэестр гарадскіх камяніц, двароў, якімі валодалі шляхціцы ці духоўныя ўстановы. На час складання рэестра было зафіксавана, што ад гарадской юрыздыкцыі адышло 9 камяніц і 92,5 гарадскіх пляцаў: 21 гарадскія пляцы трымалі шляхціцы, 43 прадстаўнікі духавенства і 28,5 яўрэі [27, ark. 2 – 9 адв.]. Так, рэестр 1720 г. зафіксаваў у Нясвіжы «камяніцы, пляцы, дамы кляштароў і іншага духавенства з іх юрыдыкамі»:

- нясвіжскіх езуітаў (Грахольская камяніца, ў якой на першым паверсе («nadole» пражывалі Раман Кухар; Кушнер і Міхаіл Гарбар;і асобна на гарадскіх пляцах жылі падданыя езуіцкай юрыдыкі: Сулімава ўдава, Сівіцкі Швец, Тамаш Століяр, Стэфан Шкляр, Марцінавая Ласоўская, Станіслаў Кравец, акрамя гэтага ў езуіцкіх падданых з горада і з іх вёскі Рудаўкі знаходзілася 5,33 валокі гарадскіх зямель);
- нясвіжскага плябана (дом алтарыі на гарадскіх пляцах, які быў забудаваны па фундушу сястры шляхціца Трыпольскага; 12 падданых: Сямён Малевіч, Ігнат Рубіс, Аляхновіч (імя не указана), Базыль Токар, Фёдар Цяпляк, Ян Залатарэвіч, Аляксандр Клішэвічткач; Яўсей Швец, Васька Рубіс, Самуэль Борцка, Лявон Прыпячай, Янка Віннік);
- нясвіжскіх дамініканаў («нямала» гарадскіх пляцаў далучылі да клаштара, у тым ліку два пляцы на Казіміру, поўпляца злотніка Андрэя

Шыманевіча, які быў атрыманы імі ў трыманне за яго доўг (сам жа злотнік пад час рэвізіў жыў у камяніцы бенедзікцінаў), гарадскі пляц, які быў атрыманы дамініканамі ад Праканоўскага;

➢ нясвіжскіх бернардзінаў (камяніца па нябошчыку шляхціцу Маляўскім; 5 падданых: Юзэф Ліннік, Захар Швец, Васіль Бондар, Міхалка Прыпячай, Пётр Кухар);

➢ нясвіжскіх бенедыктынаў (камяніца, у якой жыў Андрэй Шыманевіч злотнік, гарадскі пляц нясвіжскага мешчаніна Дарахвейчыка);

➢ нясвіжскіх бенедыкцінак (5 падданых: Аляксандр Катляр, Ярэц Ткач, Бенедыкт Слесар, Вайцех Маляр, Башура Ткач);

➢ «папоўская юрыдыка» (7 падданых: Андрэй Варонка, Фёдар Шымковіч, Пётр Квяткоўскі, Васіль Абушко, Крыштаф Цвірко, Якім Костка, Ян Каспяровіч) [27, ark. 3–6].

Пры чым падкрэслівалася, што для выплаты дзяржаўных падаткаў з горада ў 1720 г. у разлік бралася 102 адзінкі падаткаабкладання (дымы[1],аб'юраты (рэестра абкладання падаткам)). У сувязі з тым, што шляхта і духавенства з гарадскіх зямель, якімі валодала, ці трымала, не плацілі гарадскія падаткі і не выконвалі павіннасці, Нясвіж разараўся («miasto doruinyprzychodziło, przyszłoy dokącanieday Panie Bożeprzyidzie») … [27, ark. 8]. Ці была дзейнасць па ўліку гарадской маёмасці нясвіжскага магістрата у першай трэці XVIII ст. эфектыўнай у плане яе варочання пад гарадскую юрыздыкцыю пакуль не вядома, але ўжо яе наяўнасць заслугоўвае ўвагі.

Адной с функцый магістрата Нясвіжа, як гарадской улады,было правядзенне ацэначнай дзейнасці маёмасці, тавараў. Так, 7 жніўня 1727 г. радца і наместнік нясвіжскага пісарства Дамінік Бабноўскі падпісаў таксу нерухомай маёмасці (фальварка) сакратара яго каралеўскай міласці і нясвіжскага войта Мікалая Кучарскага. Фальварак здаваўся ў заставу на тры гады Лявону Шчарбіцкаму і яго жонцы. Пры складанні таксы ўлічваліся

---

[1]тут «дым» з'яўляўся умоўнай адзінкай абкладання, а не канкрэтнай колькасцю дамоў у населеным пункце

цэны таго года на «землі, пляцы, гумны, агароды, сады» і ў разлік бралася сярэдняя цана. Пры ацэнцы маёмасці ў якасці сведкаў прысутнічалі гарадскі прысяглы падвойскі Аляксандр Містукевіч і два мяшчана Новамейскага прадмесця Лаўрын Забалоцкі і Лаўрын Жукоўскі. Уся маёмасць, якая падавалася ў заставу, была ацэніна ў 2150 зл (гл. табл. 1) [26, ark. 11].

Табліца 1. Ацэнка маёмасці нясвіжскага войта Мікалая Кучарскага, якая здавалася ім ў заставу на тры гады Лявону Шчарбіцкаму. 1727 г.

| № | Від маёмасці | Кошт. зл |
|---|---|---|
| 1 | Сам фальварак з чатырма пляцамі, з вельмі старымі будынкамі, агародамі | 500 |
| 2 | Пляц каля таго фальварка (паміж пляцамі мечніка Юзафа Савіцкага і Андрэя Міхалоўскага | 40 |
| 3 | Тры пляцы за капліцай Св. Лазара | 100 |
| 4 | Гуменная зямля (7,5 гуменніц) за Новым местам у адным участку | 300 |
| 5 | Полова гуменніцы: перадам ад клецкіх прысад, тылам да выгану, з аднаго боку гуменніца Фёдара Александровіча, з другой Даніэля Чайкі | 20 |
| 6 | Гуменніца за капліцай Св. Лазара, каля вул. Стаўкоўскай, тылам ад гарадскіх пляцаў, з аднаго боку землі ўдавы Талкоўскай, з другой – Яна Рэўтовіча | 40 |
| 7 | Агарод ці пляц на Стаўкоўскай вуліцы, з аднаго боку зямля Мікалая Рыбака, з другога – Велеся; тылам ад Яўхіма Таўкачэвіча | 40 |
| | Землі ў полі | |
| 8 | 0,5 валокі каля святаміхалаўскіх прысад, з аднаго боку землі Лаўрына Жукоўскага, з другога – Базыля Жучкевіча | 130 |
| 9 | 0,5 валокі там жа, праз адну валоку, з аднаго боку землі Міхаіла Тапалеўскага, з другой – Антонія Сурміновіча | 130 |
| 10 | 1/3 валокі на Новамейскім прадмесці, якая трымалася па заставе | 50 |

| | | |
|---|---|---|
| | ад Жучкевіча | |
| 11 | Дзве валокі паміж гарадскімі землямі Казіміраўскага прадмесця | 300 |
| 12 | Сенажаць, якая была куплена ў канцлера ВКЛ, князя Караля Станіслава Радзівіла | 500 |
| | Сума | 2150 |

Не заўжды адносіны галін гарадскіх улад Нясвіжа (войта і магістрата) працякалі ў мірным рэчышчы. Часам адбываліся канфлікты, для вырашэння якіх было неабходна прыцягненне паўнамоцтваў ўладальніка горада. Так, 28 лютага 1729 г. у замкавым судзе Нясвіжскага княства разглядалася справа паміж горадам Нясвіж і нясвіжскім войтам М. Кучарскім аб розных прэтэнзіях. На судзе старшынстваваў Францішак Вайніловіч, падчашы Мозырскага павета, губернатар Нясвіжскага княства і судовы камісар, які быў прызначаны ўласнікам Нясвіжа віленскім ваяводам, гетманам ВКЛ Міхалам Казімірам Радзівілам Рыбанькам. Суд сваім дэкрэтам, напрыклад, прысудзіў камяніцу М. Кучарскага, якая была ацэнена ў 1752 зл. 29 гр., на карысць горада [26, ark. 11].

Дадзеная камяніца патрабавала значнага рамонту, які і быў зроблены за кошт горада. Пасля гэтага камяніцу гарадскія органы ўлады здавалі ў арэнду. А 11 кастрычніка 1745 г. горад па кантракту здаў тую камяніцу аптэкару князя Радзівіла Бернарду Вяжеўскаму за 100 зл. у год з абавязкам праводзіць яе рамонт. Б. Вяжэўскі пражыў у камяніцы 8 год і не выплочваў неабходнай сумы, а заплаціў «да ратушнага  скарбу» толькі частку («пеню») 86 зл. 10 гр., а 713 зл. 20 гр. яшчэ застаўся вінен. 23 чэрвеня 1753 г. «войт, бурмістры, радцы, лаўнікі і цэлы ўрад нясвіжскай магдэбургіі, ручаючыся адна асоба за другую»[2] прадалі Еве з Паўлоўскіх Бернардовай Вяжэўскай тую гарадскую

[2] Ад гарадскіх улад Нясвіжа  актпродажу гарадской камяніцы падпісаў войт Ежы Пашкоўскі, бурмістр і пісар* Ігнаці Антоні Баркоўскі, бурмістр Марцін Маслоўскі, радца Стэфан Антоні Дамброўскі, лаўнікі Антоні Баранцэвіч і Сымон Лаза.

* -- звяртае на сябе ўвагу цікавае і рэдкае спалучэнне гарадскіх пасад “бурмістр і пісар».

камяніцу за 1752 зл. 29 гр. Пры чым апісвалася яе месцазнаходджанне: рынак, на палове пляца, з аднаго боку ад камяніцы «яго міласці пана» Міхала Сталоўчыца, а другім бокам да вуліцы, якая ідзе да касцёла іезуітаў, перадам у рынак, тылам да камянічкі раней Бурвелаўскай, а цяпер Перажынскай і дварку пана Елшэўскага. Пані Ева, купіўшы гарадскую маёмасць, прыняла «гарадское права» (г. зн. абавязвалася падпадаць пад юрыздыкцыю магдэбургскага права, падпарадкоўвацца войту і магістрату, выконваць усе гарадскія павіннасці) і сама абавязалася «шукаць спосаб адабрання» того доўга ў 713 зл. 20 гр. [26, ark. 13–14]. Набыўшы камяніцу ў уласнасць пані Ева атрымала права свабоднага распараджэння сваёй маёмасцю: г. зн. мела права яе свабодна «каму захоча прадаць, даць, падараваць, абмяняць, запісаць, заставіць і на якую хоча сваю карысць як найлепей прымяніць». Неабходна падкрэсліць, што пэўныя абмежаванні распараджэння маёмасцю існавалі. Улічваючы складанасці, з якімі сутыкаўся горад у выпадку набыццём гарадскіх зямель шляхтай, духавенствам, яўрэямі (а дадзеныя катэгорыі ўласнікаў, трымальнікаў гарадской маёмасці не жадалі падпарадкоўвацца гарадской юрыздыкцыі і выконваць гарадскія павіннасці)[3], уводзілася забарона прадаваць і т.д. нерухомую маёмасць гарадской юрыздыкцыі дадзеным катэгорыям («ніякім правам, ні застаўным, ні вячыстым (продажам) іх міласцям шляхце і яўрэям не перадавалі», а тым больш не запісваць на кляштары («не легаваць»)) [26, ark.14] (дарэчы, гэта правіла было зафіксавана ў універсалах М. К. Радзівіла 1660 г., К. С. Радзівіла 1699 г. (гл. Дадатак)). Уласніца камяніцы мела права праводзіць рамонт, перабудову, знос, пабудовы новага будынку без перашкодаў ад гарадскіх улад. Уласніца камяніцы з моманку куплі гэтай маёмасці абавязвалася выконваць гарадскія павіннасці і выплочваць дзяржаўныя падаткі. Акрамя гэтага на гэтай камяніцы быў запісаны

[3]хаця універсал уласніка Нясвіжа ад 17 ліпеня 1681 г. прадпісваў, каб усе шляхецкія і духоўныя юрыдыкі горада падпадалі пад выкананне гарадскіх павяннасцяў, а універсал 14 чэрвеня 1692 г. Караля Станіслава Радзівіла прадпісваў усім сялянам, якія жылі ў Нясвіжы, усім жыхарам шляхецкіх і духоўных юрыдык падапардкоўвацца юрыздзікцыію нясвіжскай магдэбургіі (гл. Дадатак)

«фундушовы доўг»яшчэ ад Анны Енгільбрэхтаўны 1721 г. у 163 зл.– у сувязі з чым працэнт ад той сумы (квота) павінен быў быць выплачаны новай уласніцай [26, ark.14].

Фунцыянаванне магдэбургскага права ў Нясвіжы адбывалася ў цесным узаемадзеянні з адміністрацыяй уласніка: важнейшыя рашэнні адносна жыцця горада прымаліся па ўзгадненню з ўласнікам; разбор канфліктных сітуацый, незвычайных здарэнняў у горадзе рабіўся ўласнікам ці яго прадстаўнікамі\адміністарцыяй; апеляцыі на гарадскія суды падаваліся да ўласніка і т.д.

Напрыклад, 1 ліпеня 1758 г. у Нясвіжы ўласнік горада віленскі ваявода і гетман ВКЛ Міхал Казімір Радзівіл падпісаў дэкрэт судовага пасяджэння суда Нясвіжскай ардынацыі, які быў выдадзены магістрату і кагалу горада Нясвіж па пытаннях супраць пажарнай бяспекі. Выданне гэтага дэкрэта было выклікана пажарам у горадзе ў 1758 г. Асобную ўвагу дэкрэт 1758 г. надаў пытанню ўпарадкавання працы гарадскіх органаў улады Нясвіжа:

- так, фіксавалася, што нясвіжскія войты не падлягалі суду магістрата. Войт горада абавязаны быў устанаўліваць і сачыць за выкананнем паўнамоцваў магістратам, акрамя гэтага войт абавязаны быў вяршынстваваць на ўсіх судовых пасяджэннях гарадскіх судоў: як войтаўскага, так і магістрацкага;
- магістрат адказваў за захаванне унутранага парадку ў горадзе, ажыццяўляў збор і раскладку грамадскіх складак і падаткаў, фарміраваў даходную і расходную частку гарадскога бюджэта і штогод рабіў справаздачу аб расходванні гарадскіх даходаў і выкарыстанні гарадской маёмасці. Пры чым па асобным прывілею віленскага ваяводы Мікалая Радзівіла дадзеная справаздача павінна была адбывацца ў прысутнасці ўладальніка Нясвіжа – Радзівіла, ці яго нясвіжскага старосты;
- згодна з дэкрэтам 1758 г. гарадскія сходы магістратапавінны былі адбывацца два разы на тыдзень. У выпадку адсутнасці пытанняў для абмеркаванняў на такіх сходах на іх патрэбна было чытаць гарадскія

прывілеі, універсалы, ці нормы магдэбургскага права. Прысутнасць на сходзе вызначаных асоб было абавязковым, і іх адсутнасць без аб’ектыўнай прычын на парацягу трох пасяджэнняў запар павінна была карацца турэмным зняволеннем у ратушы;

- у адпаведнасці з даўнім звычаям магістрат і кагал павінны былі арганізоўваць нясенне варты каля гарадскіх брам (брамную ці цэпоўную варту), варта гарадскіх брам мянялася кожны дзень;
- як і магістрат павінен быў падтрымліваць у добрым стане грэблі і масты па дарогах, якія праходзілі па гарадской зямлі, рамантаваць брук на гарадскім рынку і вуліцах;
- магістрат павінен быў клапаціцца пра адукацыю дзяцей нясвіжскіх мяшчан [4].

Пры парушэнні сваіх правоў мяшчане мелі магчымасць адстойваць іх ў сваіх гарадскіх судах, што актыўна і рабілі. Разам з тым, сустракаліся выпадкі злоўжыванняў сваім службовым становішчам прадстаўнікамі гарадскіх органаў кіравання: войтамі, бурмістрамі і т.д. У такіх выпадках для выканання прынцыпу «святой справядлівасці» існаваў асобны механізм: гэта апеляцыі і скаргі на гарадскія органы кіравання да ўладальніка.

Напрыклад, 24 ліпеня 1779 г. у нясвіжскім гарадскім судзе, які засядаў у складзе бурмістраў Казіміра Лютніцкага, Караля Клаўзоўскага, Пятра Мірэцкага, радцаў Захарыяша Рэутавіча, Міхала Стаяновіча, Мікалая Дзямідовіча і пісара Міхала Якімовіча, па даручэнню ўласніка разглядалася скарга нясвіжскага краўца Пятра Малевіча. Справа была ў тым, што ў чацвер, у дзень торгу, П. Малевіч пайшоў на гарадскі рынак з мэтай купіць вепра. Жадаючы знайсці найбольш танны тавар, Малевіч абышоўшы торг некалькі разоў і ў рэшце рэшт вырашыў купіць вепра ў аднаго гандлюючага, да якога падыходзіў неаднойчы (першы раз яму прапаноўвалі вепра за 3 злотыя, другі – за 4, трэці – за 4,5). І калі П. Малевіч ужо вырашыў купляць вепра за 4,5 злотых, да гандляра і П. Малевіча падыйшоў нясвіжскі швец Стэфан Валянцінавіч і павысіў цану, выказаўшы жаданне купіць таго вепра за 5

злотых. П. Малевіч вельмі хацеў купіць менавіта дадзенага вепра, таму, каб таго не перакупілі, заставіў гандляру залог у 5 злотых, а сам адразу ж звярнуўся у суд «войта нясвіжскай магдэбургіі» Даමініка Пашкоўскага. Пры разглядзе дадзенага звароту войт выслухаў меркаванні і довады толькі С. Валянцінавіча, нягледзячы на тое, што скардзіўся П. Малевіч, і прызнаў правым С. Валянцінавіча. П. Малевіч прама на судзе пры ўсіх прысутных заявіў, што войт «судзіць несправядліва». За што войт яго адразу сам асабіста збіў, акрамя гэтага прыгаварыў да пакарання розгамі і турэмнага зняволенне за непавагу да суда.

Вызваліўшыся з турэмнага зняволення, П. Малевіч падаў скаргу ўладальніку Нясвіжа князю Каралю Станіславу Радзівілу. Неабходна адзначыць, што Малевіч падаў менавіта скаргу, а не апеляцыю на рашэнне войтаўскага суда.

К. С. Радзівіл накіраваў разгляд справы ў суд нясвіжскага магістрата, які разгледзеў дадзеную справу. Застаецца не вырашаным пытанне: як гэта стасуецца з пунктам дэкрэта 1758 г, згодна з якім войт не падпадаў пад прысуд магістрата. Відаць, па даручэнню ўласніка магістрат атрымліваў паўнамоцтвы суда над войтаму пэўным канкрэтным выпадку.

Па вышэйзгаданай справе 1779 г. суд магістрата прыняў наступнае рашэнне:

– па-першае, так як войт дзейнічаў не па праву, а менавіта: праводзіў пасяджэнне без перапынкаў; судзіў не «тарговым звычаем» і не «парадкавым магдэбурскім правам», а толькі па сваёй волі; не выслухаў контрдовады з двух бакоў, а толькі аднаго, прычым толькі боку, на які скардзіліся; прыняў вуснае рашэнне, а не «дэкрэт», – суд магістрата скасаваў рашэнне войта па справе П. Малевіча і загадаў С. Валянцінавічу аддаць П. Малевічу таго вепра і заплаціць таму ж Малевічу штраф у памеры 10 злотых, каб больш «спрэчак на торгу не было і не развівалася дарагавізна»;

– па-другое, улічыўшы, што войт згодна з войтаўскай прысягай і нормай магдэбургскага права павінен быць богабаязлівым і павінен быў

судзіць па справядлівасці, а «не з гневу і нізкай волі» сваёй, а Д. Пашкоўскі пры разглядзе дадзенай справы гэтых прынцыпаў не прытрымліваўся, а збіў і прыгаварыў да пакарання Малевіча бязвінна, як і ўлічыўшы, што на Д. Пашкоўскага за час яго войтаўства накапілася шмат аналагічных скаргаў, нясвіжскі магістрат пазбавіў Д. Пашкоўскага пасады войта г. Нясвіжа і прыгаварыў да штрафу ў 25 злотых на карысць П. Малевіча. Аналагічны штраф былы войт павінен быў выплаціць і іншым пакрыўджаным яго несправядлівай судовай дзейнасцю [6; 14, арк. 34–36].

Абарона права на жыццё існавала і для простых людзей, якія не ўваходзілі ў гарадскую абшчыну. Так, 31 студзеня 1755 г. суд магістрата Нясвіжа ў складзе бурмістра Марціна Маслоўскага, радцы Стэфана Дамброўскага і пісара Сымона Лазы разглядаў справу аб крадзяжы грошаў і рэчаў Анастасіяй Гаварковай у нясвіжскага мешчаніна Казіміра Аляшкевіча. У ходзе судовага разбіральніцтва было высветлена, што Анастасія Гаваркова была родам з в. Дзярэўня, мела законнага мужа Андрэя Гаварка, з якім пражыла ў браку каля шасці год і мела ад яго дачку. Але недзе ў 1752 г. яе муж Андрэй пайшоў з вёскі «вандраваць». Застаўшыся без сродкаў існавання Анастасія перабралася ў Нясвіж, дзе жыла за кошт жабрацтва, крадзяжоў і выпадковых заробкаў. Пражываючы ў горадзе, Анастасія нарадзіла яшчэ адну дачку ад нясвіжскага «жаўнера» Златкоўскага, з якім «яна сустракалася раз дзесяць». Затым Златкоўскі ўцёк са службы і з горада. Дарэчы, на судзе Анастасія Гаваркова з’явілася са сваёй другой дачкой, якой было нядзель дзесяць. Па сутнасці справы было высветлена, што Анастасія Гаваркова прыйшла ў двор Казіміра Аляшкевіча, каб папрасіць у гаспадара сродкаў на пражыванне, але дома нікога не аказалася. Дом быў зачынены на замок. Улічваючы адсутнасць гаспадароў, Анастасія выняла аконную шыбу, пранікла ў дом, знайшла ў кубку грошы, якія і забрала, прыхапіўшы невялікі кавалак тканіны, і выйшла з крадзеным з двара. У хутнім часу К. Аляшкевіч вярнуўся да дому, выявіў крадзёж і пачаў шукаць злодзея. У выніку Анастасія Гаваркова была затрымана і дастаўлена ў суд.

Суд магістрата Нясвіжа, разбіраючы матэрыялы гэтай справы («яўны і свежазроблены крадзёж»), палічыў Анастасію Гаваркову «схільнай да зладзейства» і, ўлічыўшы, што абвінавачаная здрадзіла мужу (а такім катэгорыям грамадзян было нельга жыць у горадзе), прысудзіў Анастасію да пакарання 50 ударамі розг і да выгнання з горада.

Прысуд быў прыведзены ў выкананне і жанчыну, якая яшчэ не ачуняла пасля пакарання розгамі, выгналі з дзецьмі з горада. Анастасія, аслабеўшая, адчуваючы сябе дрэнна пасля пакарання, адыйшла недалёка ад Нясвіжа і прыпынілася ля дарогі. Так як была зіма і марозы, а жанчына і дзеці не мелі добрай зімовай вопраткі – дзеці загінулі ад марозаў (замёрзлі), а Анастасію, ледзьве жывую прывезлі ў Нясвіж праязджаючыя людзі. Аб гібелі двух дзяцей Анастасіі даведалася адміністрацыя Нясвіжскай ардынацыі. У сувязі з гэтым інстыгатар Нясвіжскай ардынацыі Стэфан Цвірко, які назіраў за захаваннем законнасці і сачыў за інтэрэсамі ўладальніка ардынацыі ў дадзеным уладанні, падаў іск на нясвіжскі магістрат у ардынацкі суд аб няслушным прысудзе.

Па дадзенай справе суд Нясвіжскай ардынацыі засядаў 22 лютага 1755 г. Старшынстваваў на яго пасяджэнні ўласнік ардынацыі князь Міхал Казімір Радзівіл. У якасці абвінаваўцы выступаў вышэйадзначаны С. Цвірко, а ў якасці абвінавачаных – нясвіжскі магістрат у поўным складзе (войт Ежы Пашкоўскі, прэзідэнт (старшынствуючы на пасяджэннях магістрата, у дадзеным выпадку бурмістр) Антоні Пашкоўскі, бурмістр Марцін Маслоўскі, радца Стэфан Дамброўскі, лаўнікі Антоні Барановіч і Антоні Сулнотэр, пісар Сымон Лаза). У ходзе разбіральніцтва суд прызнаў правым абвінаваўцу, а магістратскі суд Нясвіжа вінаватым у вынясенні няслушнага прысуду. Прычынай дадзенага рашэнне было тое, што:

- суд нясвіжскага магістрата па справе Анастасіі Гаварковай засядаў не ў поўным складзе (па нормах магдэбургскага права суд павінен быў складацца як мінімум з трох суддзяў, а на пасяджэнні суда магістрата ў дадзеным выпадку прысутнічала толькі два суддзі: бурмістр і радца. Гарадскі

пісар, які прысутнічаў на судзе, не з'яўляўся суддзёй і не меў права рашаючага голасу);

• суд нясвіжскага магістрата па дадзеным пытанні засядаў не ў ратушы, як патрабавала права, а ў прыватным доме;

• суд магістрата вынес неадэкватна суровы прысуд, так як было ўкрадзена не болей за 10 тынфаў і невялікі кавалак тканіны;

• вынясшы прысуд аб выгнанні, суд не забяспечыў прыгавораную і яе дзяцей цёплай вопраткай ці «якім-небудзь прытулкам», прычынай чаго стала смерць дзяцей.

У сувязі з гэтым нясвіжскі ардынацкі суд скасаваў прыгавор суда нясвіжскага магістрата ад 31 студзеня 1755 г. адносна Анастасіі Гаварковай і прысудзіў трох асоб нясвіжскага магістрата бурмістра Марціна Маслоўскага, радцу Стэфана Дамброўскага і пісара Сымона Лазу, якія ажыццяўлялі суд 31 студзеня 1755 г. да:

• турэмнага зняволення «ў цывільнай вежы ў нясвіжскай ратушы за кратамі» на працягу 12 тыдняў, пачынаючы ад 2 мая 1775 г.;

• выплаты штрафа на карысць ратушы ў памеры 12 рублёў;

• выплаты галаўшчыны за загінуўшых дзяцей у памеры 200 злотых;

Акрамя гэтага радца Стэфан Дамброўскі і пісар Сымон Лаза пазбаўляліся сваіх пасад і ім забаранялася займаць у будучым кіруючыя пасады ў гарадскіх органах кіравання; Марцін Маслоўскі застаўся бурмістрам, так як быў супраць суда і такога суровага прысуду Анастасіі Гаварковай. Акрамя гэтага, нясвіжскім войту, прэзідэнту і іншым членам магістрата прадпісвалася пільна сачыць за працаў судоў магістрата, каб не паўтарыліся вышэйадзначаныя і не было іншых злоўжыванняў [6; 28].

У цэлым можна канстатаваць, што горад Нясвіж напрацягу XVI–XVIII стст. меў комплекс праў, свабод і вольнасцяў, які ён атымаў як ад цэнтральных органаў кіравання Рэчы Паспалітай (каралей польскіх вялікіх князёў літоўскіх, ад сойма), так і ад уладальнікаў горада князёў Радзівілаў. Дадзены комплекс праў горада разам з карпатлівай працай яго жыхароў

гарантаваў стабільнасць развіцця населенага пункта. Неабходна адзначыць, што ўладальнікі Нясвіжа надавалі яму асаблівую ўвагу, што адлюстроўвалася ў іх універсалах, пастановах, судовых дэкрэтах. Пастаянная ўвага ўласніка горада, яго адміністрацыі дазваляла аператыўна вырашаць праблемы, пытанні бягучага кіравання, якія ўзнікалі ў штодзённым жыцці горада і яго жыхароў.

## Спіс крыніц


1. Герольд. – № 3–4 (7–8). – Горадня 2002. Год II. – С. 100–101.

2. Грицкевич, А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. : соц.-экон. исслед. истории городов / А. П. Грицкевич // Акад. наук Белорус. ССР, Ин-т истории. – Минск : Наука и техника, 1975. – 248с.: 1л. карт.

3. Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. – КП № 15187.

4. Доўнар, А. Б. Дакумент 1758 г. аб мерах супрацьпажарнай бяспекі Нясвіжа / А. Б.Довнар // Acta anniversaria. Зборнік навуковых прац Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж». – Т. 1. – Нясвіж. 2015. – С. 108–115.

5. Довнар, А. Б. Добраўпарадкаванне Нясвіжа органамі гарадскога самакіравання ў сярэдзіне XVII ст. / А. Б. Довнар // Беларускі гістарычны часопіс. – 2018, №9 – С. 22 – 32.

6. Доўнар, А. Б. Статуты ВКЛ, магдэбургскае права ў Беларусі – годнасць і правы асобы / А. Б. Доўнар // Логика достоинства и свободы личности : посвящ. 85-летию Ин-та филос. НАН Беларуси / сост. и науч. ред. Л.Ф. Евменов. – Минск: Беларуская навука, 2016 – С. 192–205.

7. Копысский, З. Ю. Социально-политическое развитие городов Белоруссии в XVI–первой половине XVII в. / З. Ю. Копысский // Акад. наук Белорус. ССР, Ин-т истории. – Минск: Наука и техника, 1975. – 191с.

8. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 1537.

9. НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 1538.

10. НГАБ. – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 1361.

11. НГАБ. – Ф. 1730. – Воп. 1. – Спр. 3.

12. НГАБ. – Ф. 1819. – Воп. 1. – Спр. 2.

13. НГАБ. – Ф. 1819. – Воп. 1. – Спр. 6.

14. НГАБ. – Ф. 1819. – Воп. 1. – Спр. 9.

15. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Нясвіжскага раёна. – Мн.: Бел. Эн., 2001. – 632 с.

16. РДАСА. – Ф. 389. – Воп. 1. – Спр. 71.

17. РДАСА. – Ф. 389. – Воп. 1. – Спр. 73.

18. РДАСА. – Ф. 389, воп. 1. – Спр. 77.

19. РДАСА. – Ф. 389. – Воп. 1. – Спр. 106.

20. РДАСА. – Ф. 389. – Воп. 1. – Спр. 123.

21. РДАСА. – Ф. 389. – Воп. 1. – Спр. 139.

22. РДАСА. – Ф. 389. – Воп. 1. – Спр. 142.

23. РДАСА. – Ф. 389. – Воп. 1. – Спр. 171.

24. РДАСА. – Ф. 389. – Воп. 1. – Спр. 553.

25. Archiwum Główne Akt Dawnych (Галоўны архіў старажытных актаў) (далей – AGAD). –Archiwum Radziwiłłów (Архіў Радзівілаў) (далей – AR), dz. XV. – T. 5. – Pl. 2.

26. AGAD. – AR. – Dz. XV. – T. 5. – Pl. 23.

27. AGAD. – AR. – Dz. XV. – T. 5. – Pl. 31.

28. AGAD. – AR. – Dz. XV. – T. 6. – Pl. 27.

29. AGAD. – AR.– Dz. XV. – T. 7. – Pl. 1.

30. AGAD. – AR.– Dz. XV. – T. 18. – Pl. 1.

31. AGAD. – AR.– Dz. XV. – T. 18. – Pl. 3.

32. Archiwum domu Radziwiłłów : (listy ks. M. K. Radziwiłła Sierotki, Jana Zamoyskiego, Lwa Sapiehy) / Scriptores Rerum Polonicarum. – T.VIII; Wydawnictwa Komisyi Hist. Akad. Umiejętności w Krak. Nr 27;Epistolas ex

archivo domus Radzivilianae depromptas. – Kraków, Druk. W. L. Anczyca i Spółki. 1885. – 296 s.

33. Rimša, E. Pieczęcie miast Wielkiego księstwa Litewskiego / E.Rimša. – Warszawa, 2007. –s. 712–713.

34. Volumina legum: 22

35. Volumina legum:44444

36. Volumina legum: przed. zbioru praw staraniem XX. Pjarow w Warszawie od roku 1732 do roku 1782 wydanego. – Petersburg : Nakł. i druk. J. Ohryzki, 1860. – T. 5. – 463, XV s.

Дадатак. Прывілеі, універсалы горада Нясвіж XVI–XVIII стст.

| Дата: год.дзень. месяц | Месца выдан-ня | Назва | Ары-гіна-льнасць | Мова | Месца захоўван-ня |
|---|---|---|---|---|---|
| 1586.23.04 | Гродна | Ліст караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя, якім паведамляе М.К. Радзівілу, што згодны выдаць прывілей Нясвіжу | арыгі-нал | лат. | 25, ark. 8 |
| 1586.23.04 | Гродна | Універсал караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя гораду Нясвіж на магдэбургскае права і іншыя вольнасці | арыгі-нал | лат. | 25, ark. 11 |
| 1586.23.04 | Гродна | Прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя гораду Нясвіж на магдэбургскае права і іншыя вольнасці | копія | лат. | 16, арк. 84; 25, ark. 13–14, 17 |
| 1586.23.04 | Гродна | Прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя гораду Нясвіж на магдэбургскае права і іншыя вольнасці | копія | пе-рак-лад. на пол. | 25, ark. 16, 15 |
| | | Пункты з прывілеяў караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя і | | лат. | 25, ark. 23 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | М.К.Радзівіла, якія ўтрымліваюць упэўненні, што дарованыя правы будуць захоўвацца і памнажацца | | | |
| 1586.31.05 | Гродна | Прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя на магдэбургскае права і другія правы г. Нясвіжа | копія | пол. | 16, арк. 86 адв. – 87 адв. |
| 1586.18.06 | Нясвіж, замак | Прывілей Мікалая Крыштафа Радзівіла на магдэбургскае права, 100 валок зямлі Нясвіжу з падараваннем на карысць горада на 50 год платы з іх, і торговага, капшчызны | копія | пол. | 8, арк. 54 адв. – 56; 9, арк. 27–28 адв.;10, арк. 6 – 8 адв.; 30, ark. 27 |
| 1586.24.06 | Гродна | Прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя Нясвіжу на магдэбургскае права, герб і іншыя вольнасці | копія | лат. | 10, арк. 1 – 2 адв.; 30, ark. 1–3 (№1) |
| 1586.24.06 | Гродна | Прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя Нясвіжу на магдэбургскае права | копія | пол. | 10, арк. 5–5 адв.; 25, ark. 16, 15 |
| 1586.24.06 | Гродна | Прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя Нясвіжу на магдэбургскае права, герб і іншыя вольнасці | копія | пе-рак-лад на пол. | 25, ark. 18 –21<br>30, ark. 17 –19 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1586.24.06 | Гродна | Універсал караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя аб наданні магдэбургскага права Нясвіжу | копія | ста-ра-бел. | 17, арк. 190 адв. – 193. Апубліка-вана: 15, с. 51–52 |
| 1588.28.01 | Кракаў | Пацвярджальны прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы Нясвіжу на магдэбургскае права, герб і іншыя вольнасці | копія | лат. | 10, арк. 3 – 4 адв.; 25, ark. 46–47, 51–52; 30, ark. 3–6 (№2) |
| 1588.28.01 | Кракаў | Копія прывілея караля польскага вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы Нясвіжу на магдэбургскае права, герб і іншыя вольнасці | копія | пе-рак-лад на пол. | 25, ark. 48 –50 |
| 1588.02.02 | Кракаў | Універсал караля польскага вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы з паведамленнем аб выдачы прывілея Нясвіжу на магдэбургскае права, герб і іншыя вольнасці | копія | ста-ра-бел. | 17, арк. 298–300 |
| 1589.01.03 | Нясвіж, замак | Прывілей Мікалая Крыштафа Радзівіла нясвіжскім яўрэям | копія | пол. | 8, арк. 49–50 адв.; 10, арк. 27–28 адв.; 25, ark. 53–57 (спіс1); 59– |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 63 (спіс2); 66 (спіс 3) |
| 1589.01.03 | Нясвіж | Выпіс з нясвіжскіх магдэбургскіх кніг копіі прывілея Мікалая Крыштафа Радзівіла нясвіжскім яўрэям | арыгі-нал | пол. | 25, ark. 68-70 |
| 1589 | | Канстытуцыя сойма Рэчы Паспалітай (РП), якая пацвярджала правы Нясвіжу | | пол. | згадана ў суд. рашэнні ардынац-кага суда Нясвіж. кн-ва ад 01.07.1758. – 30, ark. 69 |
| 1593.06.03 | Чарнаў-чыцы | Прывілей князя на Алыцы і Нясвіжу, графа на Шыдлаўцу і Міру Мікалая Крыштафа Радзівіла г. Нясвіж на 12 валок нясвіжскага бору | арыгі-нал, копія | пол. | 10, арк. 10; 3, КП № 15187; Апублікав ана: 1, с. 100–101. |
| 1595 | Кракаў | Канстытуцыя сойма РП, пацвярджаючая правы Нясвіжу (друкаваная – у друкарні Лазаровай, 1595г.) | арыгі-нал і копія | пол. | 25, ark. 76; 25, ark. 72; 34, s. 355, п. 4 |
| 1595.18.03 | Кракаў | Універсал караля польскага вялікага князя літоўскага | копія | стара-бел. | 18, арк. 603–604 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Жыгімонта Вазы на пацвярджэнне гораду Нясвіж магдэбургскага права і іншых вольнасцяў | | | |
| 1595 | Кракаў | Копія прывілея караля польскага вялікага князя літоўскага Стэфана Баторыя ад 23.04.1586 гораду Нясвіж на магдэбургскае права і іншыя вольнасці выдадзеная ў 1595 г. праз канстытуцыю сойма РП | копія | пол. | 25, ark. 13 |
| 1595.12.04 | | Універсал М.К. Радзівіла да горада Нясвіж аб недбайстве, гультайстве і непаслушэнству гораду, пра рамонт дарог, капання равоў, высаджвання прысад | | | згад. ў суд. рашэнні ардынацкага суда Нясвіж. кн-ва ад 01.07.1758. – 30, ark. 68 |
| 1595.03.06 | | Прывілей князя Мікалая Крыштафа Радзівіла на 12 валок бору Нясвіжу | | | згад. ў рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 143 |
| 1598.15.01 | Нясвіж, замак | Асекурацыя нясвіжскаму магістрату, якая была дадзена М. К. Радзівілам на вечнае захаванне 1000 злотых на нясвіжскіх «убогіх мейскіх панен», прызначанае фундушам і | копія | пол. | 9, арк. 29 – 29 адв.; 10, арк. 9 – 9 адв.; 30, ark. 34–35 (толькі |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | на рэгулярныя штогадовыя выплаты | | | пачатак). Згадана ў 25, ark. 182 |
| 1598.15.01 | Нясвіж, замак | Асекурацыя нясвіжскаму магістрату, дадзеная М. К. Радзівілам на вечнае захаванне 1250 злотых на нясвіжскі шпіталь, прызначаныя фундашам і на рэгулярныя штогадовыя выплаты | копія | пол. | 9, арк. 29 адв. – 30; Згадана ў 25, ark. 182 |
| 1598.27.09 | Нясвіж | Плебісцыт ці ўстава горада Нясвіж | копія | пол. | 9, арк. 30 адв. – 31 |
| 1606.16.02 | | Прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы г. Нясвіжу на пацвярджэнне вызвалення ад мытаў | копія | пол. | 10, арк. 18 адв. –19 |
| 1606.26 02 | | Экстракт на кравецкі цэх Нясвіжа | | | згад. у рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 145 |
| 1611.08.03 | | Устава кушнерскага цэху, якая была пацверджана нясвіжскім магістратам | | | згад. у рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 145 |
| 1615.16.02 | Варшава | Універсал караля польскага, вялікага князя літоўскага | копія | пол. | 25, ark. 81–82; |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Жыгімонта Вазы г. Нясвіжу аб вольнасці на каморах | | | 30, ark. 19–20 |
| 1617.04.03 | | Прывілей Яна Ежыга Радзівіла на шэўскі цэх у Нясвіжы | | | згад. у рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 145 |
| 1617.08.01 | | Універсал М.К.Радзівіла на нясвіжскае войтаўства | | | згад. у рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 143 |
| 1617 | Нясвіж, замак | Копія прывілея троцкага кашталяна Яна Ежы Радзівіла на падцвярджэнне праў і вольнасцяў Нясвіжа | копія | пол. | 25, ark. 84–86 |
| 1620.09.01 | | Універсал Ежы Радзівіла, каб мяшчане з броняй (броней) не хадзілі да гарадской скрынкі | | | згад. у рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 143 |
| 1621 | | Два прывілеі караля польскага вялікага князя літоўскага Жыгімонта Вазы г. Нясвіжу на два кірмашы | | | згад. у рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 145 |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1627.14.04 | | Зацвярджэнне нясвіжскім магістратам уставы купецкага цэху | | | згад. у рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 145 |
| 1633.15.02 | | Прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Уладзіслава Вазы нясвіжскім яўрэям | | | згад. у рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 145 |
| 1633.02.03 | Кракаў | Прывілей караля польскага вялікага князя літоўскага Уладзіслава Вазы, якім пацвярджае ўсе ранейшыя прывілеі Нясвіжа | копія | пол. | 10, арк. 11–12; 19, арк. 134–139; 30,ark. 6–8 (№3) |
| 1636.23.08 | | «Артыкулы мулярскія і ганчарскія», выданыя з Мінска | | | згад. у рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 145 |
| 1641.20.05 | | Прывілей Аляксандра Людвіка Радзівіла на кушнерскі цэх у Нясвіжы | | | згад. у рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 145 |
| 1641.29.09 | | Устава кушнерскага цэха, якая | | | згад. у |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | была выдадзена нясвіжскім магістратам | | | рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 145 |
| 1645 | | Прывілей Караля Станіслава Радзівіла на муральскі цэх г. Нясвіжа | | | згад. у рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 145 |
| 1646.02.11 | | Універсал Аляксандра Радзівіла нясвіжскаму магістрату, каб да лавіцы «ідыётаў» не прымалі | | | згад. у рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 143 |
| 1647.07.03 | Кугавяны | Універсал маршалка ВКЛ Аляксандра Людвіка Радзівіла да нясвіжскіх яўрэяў, каб усе гарадскія павіннасці (напрыклад, сыпанне гарадскога вала) выконвалі разам з мяшчанамі з 17 пляцаў | копія | пол. | 10, арк. 19 – 19 адв.;<br>25, ark. 89–90<br>30, ark. 52–53 |
| 1647.03.07 | Нясвіж, замак | Універсал маршалка ВКЛ А. Л. Радзівіла да шляхты, якая трымала гарадскія землі ў Нясвіжы, каб выконвалі гарадскія павіннасці | копія | пол. | 10, арк. 23 – 23 адв. |
| 1649.04.02 | Кракаў | Прывілей караля польскага, вялікага князя літоўскага Яна | копія | пол. | 20, арк. 86 адв. – |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Казіміра г. Нясвіжу на пацвярджэнне магдэбургскага права і іншых праў і вольнасцяў | | | 87;<br>10, арк. 12 адв.;<br>25, ark. 91<br>30, ark. 9 (№4) |
| 1654.13.05 | | Універсал Міхала Казіміра Радзівіла, каб нясвіжскія мяшчане будаваліся пасля пажара | | | згад. у рэестры прывілееў 1758, – 29, ark. 143 |
| 1654 | | Канстытуцыя сойма РП аб вызваленні Нясвіжа ад падаткаў на 4 гады ад усіх падаткаў РП у сувязі з пажарам<br>(у суд. рашэнні ардынацкага суда Нясвіж. кн-ва ад 01.07.1758. адзначана, што яна пацвярджала правы Нясвіжа<br>– 30, ark. 69 | | | 35, s. 219 |
| 1654.29.08 | | Універсал краўчага ВКЛ Міхала Казіміра Радзівіла, каб з-за пагрозы непрыяцеля нясвіжскія прадмяшчане звозіліся з дамамі ў горад | | | згад. у суд. рашэнні ардынац-кага суда Нясвіж. кн-ва ад 01.07.1758. – 30, ark. |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
гарніцы меры літоўскай для вымярэння ўсякага збожжа і ўстанаўляем гандлёвыя зборы па дзве манеты з бочкі. Такія ад іншых рэчаў прадажных і тавараў, як бы яны не называліся, у кожную суботу кожнага тыдня трэба браць частку ў гарадскую скарбніцу на карысць горада, акрамя лапатак і іншых пабораў войта, ад людзей пабочных, якія будуць прыязджаць на гандаль, акрамя ўсіх мяшчан і грамадзян з ваколіц Ліды, якія павінны быць вызвалены ад розных гандлёвых збораў згодна звычаю іншых прывеліяваных гораду нашых. Да гэтага згаданаму гораду Лідскаму, яго грамадзяне ўсе гарадскія землі, гэта значыць у вуліцах, сядзібах, садах, засценках, сенакосах адмераныя і падзялёныя межамі і знакамі без памяншэння, а толькі, як Нашыя рэвізоры гэтаму гораду надзялілі, гэтыя землі ў даўжыню і ў шырыню гэтым Нашым прывілеем даём у карыстанне з усімі абшчарамі ім самім і іх нашчадкам згодна звычаю іншых нашых прывіліяваных гарадоў. З гэтых гарадскіх зямель, дадзеных Гэтаму гораду, кожны са згаданых мяшчан павінен усе падаткі, зборы і іншыя абавязкі згодна з Нашымі законамі Вялікага Княства Літоўскага, Намі зацверджанымі, паводле звычаю кожны год плаціць у нашую скарбніцу.Даходы і падаткі гарадскія войт з заседацелямі гэтага горада абавязаны збіраць і здаваць Нашаму Лідскаму старасту, а пры яго адсутнасці ўрадніку і браць на гэта квітанцыі і з кожнай квітанцыі ў гарадскую скарбніцу браць не больш шасці грошаў, каб жыхары горада Ліда пакрывалі патрэбнасці горада, утрыманне вуліц і дарог і іншыя гарадскія патрэбнасці, а самі таксама добра будавалі свае дамы.На пакорную іх просьбу з Нашай ласкі ўсе зборы і падаткі з дамоў,сядзіб і гарадскіх плошчаў усе грамадзяне горада згаданага Лідскага на аснове гэтага нашага ліста, якім мы на іх карысць іх падаравалі, не будуць плаціць на вечныя часы. Акрамя таго на патрэбнасці і на карысць Нашага згаданага горада даём гэтым прывілеям даходы розныя з лазні, вагаў і царульні, якія жыхары горада хочуць будаваць. Для бяспекі лазня павінна быць пабудавана ў баку ад горада і не адзін жыхар не мае права будаваць уласную лазню каля свайго дома, але мы пастанавілі,што павінна быць толькі адна агульная лазня.

Жадаем таксама, каб шляхта, баяры, людзі службовыя , любога стану, якія ў згаданым Нашым горадзе маюць сядзібы, і якія ні Нашымі асаблівымі лістамі, не статутамі Сойма не вызввалены ад гарадскіх абавязкаў з сваіх сядзібаў, таксама як і грамадзяне Лідскія згодна з такім жа правам без супраціву выконвалі ўсе абавязкі перад гарадскім кіраваннем, як і ўсе Лідскія грамадзяне на рынку, гарадскіх вуліцах, цераз рэчкі, канавы ў патрэбных месцах горада будавалі масты і масцілі дарогі, а таксама за свой кошт пабудавалі гарадскую ратушу, гадзіннік і хрысціянскую школу. Таксама дарогі і вялікія тракты ў межах гарадскіх зямель размешчаныя, павінны будуць рамантаваць. Пад і каля ратушы, якая павінна быць пабудавана, трэба стварыць агульныя гандлёвыя пункты і магазіны для складвання тавару і вядзення розных гандлёвых спраў. З гэтых гандлёвых пунктаў гарадское кіраванне павінна браць падаткі і арэндную плату на карысць горада. Для бяспекі ад агню соладавы і піўзаводы павінны будавацца з баку ад горада. Для той жа бяспекі ад агню абявязваем усіх і кожнага асобна гараджан, каб муравалі і добра аздаблялі каміны. Хаця касцёл Лідскі быў святлейшым і пяпярэднікамі Нашымі пабудаваны і аддадзены гораду. То ў горадзе няма ніякай плошчы для бальніцы. Таму Нашыя Лідскія мяшчане павінны ўказаць мейсца на рынку пад замкам, недалёка ад касцёла, каб на гэтым мейсцы была пабудавана бальніца. Для лепшай веры і сведчання ўсіх гэтых спраў, вышэй названых Мы далі ўсім мяшчанам Нашага Лідскага горада цяперашнім і будучым гэты Наш ліст з подпісам Нашай рукой Каралеўскай, да якога загадалі павесіць нашую пячатку. Напісана ў Варшаве года Божага нараджэння тысяча пяцьсот дзевяностага месяца верасня сямнаццатага дня".

*(Подпіс рукі яго каралеўскай міласці такімі словамі: Жыгімонт кароль. Яраш Валовіч пісар. Пячатка Вялікага Княства Літоўскага падвешана). (пераклад і адаптацыя да сучаснай беларускай мовы Станіслава Судніка)* [8, с. 34-35].

Ратуша была неад'емным элементам горада, які меў Магдэбургскае права. Менавіта ў ёй павінны былі размяшчацца (і размяшчаліся) органы

гарадскога самакіравання - рада (прататып гарадскога Савета), магістрат (накшталт сучаснага гарвыканкама), засядала лава (мясцовы суд, які разглядаў дробныя пытанні, у асноўным маёмасныя), тут знаходзіўся бургамістр. Акрамя гэтага ратуша павінна была выконваць чыста ўтылітарныя функцыі, звязаныя з упарадкаваннем гандлю. Дарэчы, Магдэбургскае права атрымлівалі менавіта тыя гарады, у якіх быў добра развіты гандаль. І гэта з'яўляецца прычынай таго, што ратуша заўсёды будавалася на рынку. Менавіта ў ратушы захоўваліся меры і вагі, якія выкарыстоўваліся на рынку. У той час яшчэ не было Міжнароднай метрычнай сістэмы мер. У розных краінах, мясцовасцях яны былі розныя. Але з 1590 г. ў Лідзе ў гэтым плане быў наведзены парадак. З'явіліся стандартныя меры і вагі. Карэц - гэта коўш з вялікай ручкай, якім звычайна насыпалі зерне. Гарнец - таксама мера аб'ёму, толькі драбнейшая. Гарнцом мералі і гарэлку. У ратушы таксама ляжалі гіры. Ратуша з'явілася адразу пасля надання гораду Магдэбургскага права. Яе пабудавалі за год-два [8, с 33].

Атрыманне Магдэбургскага права было значнай падзеяй у жыцці сярэдневяковых мяшчан, яно давала сур'ёзныя перавагі: гараджане вызваляліся ад феадальных падаткаў, ім гарантаваўся большы занятак рамяством, гандлем, земляробствам, дазвалялася выбіраць свае органы самакіравання - Магістрат (Раду) і Лаву.

У гарадах з Магдэбургскім правам усю адміністрацыйную і судовую ўладу ажыццяўлялі Рада і Лава. Рада сачыла за гандлем і рамяством, кантралявала дакладнасць мер і вагаў, падтрымлівала парадак, сачыла за станам дарог, мастоў, заезных двароў, ажыццяўляла судовыя разборы па маёмасных і грамадзянскіх справах. Лава ўяўляла сабой судовы орган па крымінальных справах. Узначальваў Раду Войт, які прызначаўся вялікім князем пажыццёва, ён жа быў вышэйшай судовай інстанцыяй. Сябры Рады называліся радцамі, сябры Лавы - лаўнікамі, тыя і тыя вызваляліся ад гарадскіх падаткаў. Кандыдатаў у радцы і лаўнікі прапаноўваў сход

гараджан, зацвярджаў войт. Радцаў выбіралі штогод, лаўнікаў на 2-3 гады. Колькасць раднікаў хісталася ад некалькіх чалавек да двух дзесяткаў, напрыклад у Навагрудку Рада складалася з 6 чалавек, а ў Полацку з 24. Радцы са свайго складу выбіралі бурмістра. Бурмістр праводзіў паседжанні Рады. У Лаве старшынстваваў войт або прызначаны ім лендвойт. Рада мела пячатку, малюнак якой з'яўляўся гербам горада. Толькі малюнак на пячатцы Рады прызнаваўся паўнапраўнай выявай гарадскога герба [5, с. 66].

Ліда ў канцыXVI– пачаткуXVIIст.складалася з замка, двара, уласна горада і прадмесця Зарэчча. Замак абкружаны з трох бакоў забалочанай Лідзейкай і Каменкай, з чацвёртай (паўночнай) – глыбокім рвом, быў вялікакняжай уласнасцю, падтрымліваўся і ахоўваўся тутэйшай шляхтай, служыў складам зброі, месцам збору павятовых соймікаў і вязніцай. Унутры замка знаходзіліся драўляныя пабудовы, вязніца размяшчалася ў падвальным паверсе паўночна-усходняй вежы. Замкавы фальварак размяшчаўся над ручаём Каменкай, за ім знаходзіліся вінакурні і млыны. Горад размяшчаўся на поўнач ад замка, меў рынак і чатыры вуліцы. Зямля, занятая горадам, складала ўласнасць Вялікага князя, аднак з сярэдзіны XVI ст. частка яе пераходзіць у прыватную ўласнасць [10].

Ліда была горадам земляробскім: лідскія мяшчане апрацоўвалі выдзеленыя ім за горадам участкі плошчай па 1/4-1/6 валокі (3,5-5,3 га). За кожны ворны морг (0,71 га) лідзяне плацілі 5 грошаў, за сенакосны - па 2 грошы штогадовачыншу (падатку) у даход замкавага двара. Гэта вялікі падатак, у іншых гарадах за морг ворнай зямлі плацілі 1,5-2 грошы.

Рамёствы ў горадзе былі развіта слаба: згадваюцца кавалі, гарбары і рэзчыкі па дрэву. Затое былі шматлікія мядовыя, гарэлачныя і піўныя карчмы. Насельніцтва колькасцю да 5 тысяч чалавек было рознамоўным і паліканфесійным. Былі дзве царквы, прыходскі касцёл, пабудаваны ў 1414 г., кальвініцкі збор і сінагога, заснаваныя ў 1579 г. з дазволу Вялікага князя Стэфана Баторыя.

У 1566 г. пры адміністрацыйнай рэформе да Лідскага староства былі далучаны Васілішкаўская і Эйшышкаўскае намесніцтвы са складу Троцкага ваяводства і ўтвораны Лідскі павет. У 1568 г. на вальным Віленскім Сойме была прынята пастанова аб далучэнні да прысуду Лідскага павету Эйшышскага, Радуньскага, Каняўскага, Дубічскага, Васілішкаўскага і Астрынскага харугстваў Трокскага павету Трокскага ваяводства. У той жа год Вялікі князь Жыгімонт Аўгуст дазволіў праводзіць паседжанні земскага суда ў адной з вежаў Лідскага замка. Дзякуючы гэтым тром рашэнням Ліда стала буйным судовым цэнтрам. Расшырэнне прысуду паўплывала на рост дабрабыту горада, павялічыла прыбыткі гараджан і Ліда стала паступава разрастацца [10].

Старастам Ліды ў гэты час быў Ян Абрамовіч - ваявода Менскі (1593), пісьменнік, дзяржаўна-рэлігійны дзеяч, выдавец кальвініцкіх кніг. Паходзіць са старажытнага роду Абрамовічаў, якія славіліся багаццем і адукаванасцю.

Удзельнічаў ў кальвінісцкіх дыспутах з езуітамі, у Торуньскім сінодзе (1595), у нарадзе з праваслаўнымі ў Вільні (1599). Ва ўласным маёнтку Варняны (зараз Астравецкіраён) заснаваў кальвінісцкі збор, бальніцу, школу, якія існавалі да сярэдзіны XVII ст. Выдаў у Вільні ў 1598 г.евангелісцкі “Катэхізіс”, што змяшчаў 300 рэлігійных песень, яму прыпісваюць аўтарства твора “Погляды ліцьвіна на танную куплю і большдарагі продаж збожжа” (1595), у якім абараняецца права, падпісаны каралём Рэчы Паспалітай Жыгімонтам III Ваза і адначасова Вялікім князем Літоўскім Жыгімонтам IV Ваза. Магдэбургскае права мог дацьтолькі кароль - гэта была яго прывілегія. Магдэбургскае права Ліда страціла ў 1795 г. з далучэннем да Расійскай імперыі [10].

Ян Абрамовіч спрыяў зацвярджэнню гарадскога герба і пячаткі.

## *Глава 4. Герб Ліды.*

Лідскі герб — адзін з самых старажытных, пэўна толькі 11 гарадоў маюць больш старажытныя гербы. Лідскі герб старажытней за Віцебскі,

Гомельскі, Бабруйскі і на 3 месяцы старажытней за Мінскі. Герб горада Ліды канца XVI ст. з’яўляецца гісторыка - культурнай каштоўнасцю.

Лідскі герб — гарадская візітная картка — уяўляе сабой шчыт, падзелены на дзве палавіны, на левай з якіх, чырвонага колеру, — залаты леў, які стаіць на задніх лапах і разгорнуты ўлева, а на правай, блакітнага колеру, — два залатыя скрыжаваныя ключы. Выява на ім льва і ключоў мае шырокае талкаванне. Па аднаму з паданняў два ключы ўручаны Ісусам апосталу Пятру ад варот раю і пекла [1, с. 158].

Леў — самая любімая геральдычная жывёла: ён асацыіруецца з сілай, магутнасцю, велікадушнасцю, высакароднай адвагай. Лідскі леў тыповы — ён стаіць у звычайнай геральдычнай позе: на задніх лапах, пярэднімі атакоўвае, разгорнуты ў профіль — бачна адно вока, язык высунуты з пасткі, хвост падняты і загнуты, але ў адрозненні ад тыповых львоў — на лідскім гербе ён разгорнуты ўлева. Чырвонае поле — сімвалічнае поле, якое прамочана крывёю ворагаў. Толькі тры беларускія гарады маюць выяву льва на сваіх гербах: Ліда, Слонім і Гарадок Віцебскай вобласці. Усе гэтыя гербы адносяцца да XVI ст. Лідскі і Слонімскі геральдычныя львы абсалютна ідэнтычны і разгорнуты ўлева ад гледача, адзінае адрозненне — слонімскі леў у правай лапе трымае радавы знак сямейства Сапегаў.

Выява ключоў даволі часта выкарыстоўвалася ў заходне-еўрапейскай геральдыцы.На некаторых гербах адзін ключ адлюстроўваўся залатым, а другі - срэбным, прычым залаты ключ пазначаўся як “які злучае”, а срэбны - “які дазваляе”. Два ключы як атрыбут апостала Пятра мы бачым у гербах Малеча і Барысава. Ключы намаляваныя на гербах Брэмена, Регенсбурга, Штаде і іншых заходнееўрапейскіх гарадоў. Перахрышчаныя ключы, мелі характэрную гатычную канфігурацыю, з характэрным галаўным уборам рымскіх пап, з'яўляюцца часткай герба Ватыкана [1, с. 159].

Скрыжаваныя залатыя ключы адзіныя на беларускіх *гербах*, калі не лічыць герба в. Малеч Брэсцкай вобласці, дзе ключы адлюстраваны ў выглядзе аксэсуара на жываце Святога Пятра. Блакітны колер азначае

паветра, ключы на блакітным, магчыма, ключы ад рая, калі жыццё пражыў мужна. Шчыт французскага тыпу— прадаўгаваты, чатырохвугольны, з закругленымі ніжнімі краямі, якія сыходзяцца над вуглом.

Вядомы знаўца беларускай геральдыкі А. Цітоў у Санкт-Пецярбургскім сховішчы рукапісаў адшукаў прывілей ад 17 верасня 1590 г. — вялікі пергаментны ліст, на якім напісана, што г. Ліда прысвоена “для одправованья справ судовых местских печать месткая то есть лев и два ключы на крыж над ним”. У актавым запісе прывілеяў горада Ліды, унесеным у судовыя кнігі ў 30-ыя гады XVIII ст., прыведзены тэксты ўсіх папярэдніх прывілеяў, пачынаючы ад першага. Але на захаваўшыхся ў першым прывілеі контурах малюнка відаць, што леў павернуты ўлева, а ў левай частцы насупраць яго два скрыжаваныя ключы. Дарэчы, малюнак па агульных рысах вельмі супадае з першай пячаткай лідскага магістрата, якая знойдзена Цітовым [9, с. 185].

Цікава адзначыць, што ўсе наступныя варыянты лідскіх пячатак маюць адметныя рысы — леў накіроўваецца ў правы бок герба, што з'яўляецца з пункту гледжання геральдыкі больш правільным. У сувязі з гэтым хочацца заўважыць, што, магчыма, першы варыянт пячаткі, нягледзячы на тое, што яго адбіткі былі знойдзены на дакументах XVIII ст., па паходжанні ставіцца да старажытных: майстра, які рэзаў пячатку, паўтарыў малюнак з прывілея, унёсшы ў яго мінімум змен.

У Лідскім гарадскім гербе мы сустракаемся з выпадкам, калі малюнак герба не адпавядае яго слоўнаму апісанню, якое дадзена ў тым жа прывілеі. Растлумачыць гэтую з'яву цяжка, але, на наш погляд, мы маем справу хутчэй за ўсё з механічнай памылкай пісара канцылярыі, якая была ігнаравана, і калі рабілася пячатка, за аснову быў узяты малюнак, а не яго слоўнае апісанне. Гэта сведчыць пра тое, што пры выбары гарадскіх пячатак графічным выявам адводзілася больш значнае месца, чым пісьмовым крыніцам [3, с. 27].

У другой палове XVIII ст. герб Ліды, як ужо вышэйпісалася, крыху змяніўся — шчыт герба рассякаецца. Гэта запатрабавала змену колераў

частак шчыта. Паводле апісання, у правай частцы шчыта леў залаты ў чырвоным полі, а ў левай — блакітнай — два скрыжаваныя залатыя ключы. Хаця, паводле правілаў геральдыкі, ключы павінны быць срэбнага колеру.

*Заключэнне*

Аналіз гістарычнага вопыту горада Ліды ў кантэксце ўплыву Магдэбургскага права дазваляе зрабіць шэраг важных высноў, якія выходзяць за межы асобнага населенага пункта і асвятляюць агульныя тэндэнцыі развіцця гарадоў на беларускіх землях у перыяд яго дзеяння. Ліда стала своеасаблівым люстэркам, у якім адлюстраваліся як станоўчыя, так і некаторыя складаныя аспекты гэтага працэсу.

Перш за ўсё, варта падкрэсліць, што атрыманне Магдэбургскага права стала для Ліды, як і для многіх іншых беларускіх гарадоў, магутным стымулам для эканамічнага росту. Атрыманне самакіравання, права на свабодны гандаль і рамяство, а таксама стварэнне ўласных судовых і адміністрацыйных органаў спрыялі развіццю гарадской гаспадаркі. Ліда, дзякуючы сваёй геаграфічнай пазіцыі і атрыманым прывілеям, змагла актывізаваць сваю гандлёвую дзейнасць, прыцягнуць новых рамеснікаў і купцоў, што, у сваю чаргу, павысіла яе эканамічны патэнцыял і прывабнасць.

Аднак, аналізуючы вопыт Ліды, нельга абысці і некаторыя складанасці. Уплыў Магдэбургскага права не быў аднолькавым і не заўсёды прыводзіў да ідэальнага развіцця. Акрамя таго, прынцыпы Магдэбургскага права хоць і былі прагрэсіўнымі для свайго часу, не заўсёды адпавядалі мясцовым сацыяльна-эканамічным рэаліям, што патрабавала пэўных адаптацый і кампрамісаў.

У цэлым, гістарычны вопыт горада Ліды пацвярджае, што Магдэбургскае права адыграла ключавую ролю ў фарміраванні беларускіх гарадоў як цэнтраў эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця. Яно спрыяла ўмацаванню гарадской ідэнтычнасці, развіццю гандлю і рамяства, а таксама стварэнню асноў для будучага развіцця гарадской культуры. Вывучэнне гэтага вопыту дазваляе лепш зразумець працэсы, якія фарміравалі

беларускія гарады, і аацаніць значэнне прававых інстытутаў у гістарычным развіцці.

Спіс крыніц


1. Адамушка, В. І. Гербы і флагі Беларусі / В. І. Адамушка, М. М. Ялінская. – Мінск : Беларусь, 2006. - 254 с.

2. Келер В. Б. Магдэбургскае права/ В.Б. Келер // Спадчына – Мінск, 1997. №5. - С. 90-101.

3. Кулеш, А. Ф. Горад Ліда: гісторыя, легенда, факты / А.Ф. Кулеш // Папулярны гісторыка-геаграфічны нарыс – Ліда : Лідская друкарня, 1994. – 120 с.

4. Місарэвіч, Н. В. Магдэбургскае права на Беларусі: Манаграфія / Н. В. Місарэвіч // - Гродно: Гродненский гос. ун-т, 2003. — 107 с.

5. Памяць. Ліда. Лідскі раён : Ліда. Лідскі раён гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / [рэдкал.: В. Г. Баранаў і інш.]. — Мінск : Беларусь, 2004. — 565 с.

6. Рагачэўскі, А. Л. Меч Роланда: Прававыя погляды нямецкіх гараджан XIII-XVII стст. / А. Л.Рагачэўскі. – Санкт-Пецярбург : Выдавецтва Санкт- Пецярбургскага ўніверсітэта, 1996. – 156 с.

7. Решецкая, Т. Н. История государства и права Беларуси : курс лекций для студентов, обучающихся по специальности 1-24 01 02 Правоведение / Т. Н. Решецкая ; Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь, Главное управление образования, науки и кадров, Белорусская государственная сельскохозяйственная академия. — Горки : БГСХА, 2020. — 119 с.

8. Суднік, С. В. Пытанні аднаўлення Лідскай ратушы / С. В. Суднік // Лідскі летапісец – Ліда, 2022.– № 3 –4 (99-100). – С.33 – 42.

9. Цітоў, А. К. Геральдыка Беларускіх месцаў / А.К.Цітоў –Мінск : Полымя, 1998.—287с.

10. Магдэбурскае права ў Лідзе – URL: https://pawet.net/library/history/city_district/common/magdeburg (дата обращения: 10. 03. 2026).

*Віткоўская Т.У., Вішнеўская І.М.*

# РАТУШЫ БЕЛАРУСІ ЯК АБ'ЕКТЫ ЎЛІКУ ДЗЯРЖАЎНАГА ІНФАРМАЦЫЙНАГА РЭСУРСУ «БАНК ЗВЕСТАК АБ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ»

**Анатацыя.** Даклад прысвечаны дзяржаўнаму інфармацыйнаму рэсурсу «Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь» (heritage.gov.by) і ратушам Беларусі як аб'ектам уліку дадзенага рэсурсу. Разглядаюцца прававая аснова Банка звестак, структура электроннага пашпарта гісторыка-культурнай каштоўнасці з акцэнтам на апісанне аб'ектаў архітэктуры, а таксама гісторыка-архітэктурная характарыстыка сямі ратуш Беларусі, аналіз іх сучаснага стану і выкарыстання.

*Ключавыя словы: ратуша, магдэбургскае права, Банк звестак, электронны пашпарт, аб'ект архітэктуры, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, heritage.gov.by.*

Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны немагчыма без яе сістэматычнага ўліку. У Беларусі існуюць два асноўныя ўліковыя рэсурсы: дзяржаўны інфармацыйны рэсурс «Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь» (gosspisok.gov.by) і «Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь» (далей – Банк звестак) (heritage.gov.by). На сёняшні дзень статус гісторыка-культурнай каштоўнасці (далей – ГКК)нададзены 5695 аб'ектам. У адпаведнасці з патрабаваннямiўсе яны адлюстраваны ў гэтых рэсурсах.

Банк звестак з'яўляецца дзяржаўным інфармацыйным рэсурсам, які ўяўляе сабой сістэматызаваны збор звестак аб адметных выніках і сведчаннях гістарычнага, культурнага і духоўнага развіцця народа Беларусі, увасобленых у гісторыка-культурных каштоўнасцях. У Банку звестак павінны захоўвацца раздзелы навукова-праектнай дакументацыі на выкананне работ на ГКК, іншыя матэрыялы (фатаграфіі, схемы, архіўныя дадзеныя), якія тычацца гісторыка-культурнай спадчыны.

Галоўным дакументам, які рэгламентуе парадак фарміравання, вядзення і выкарыстання Банка звестак з’яўляецца Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры (ад 20 ліпеня 2016 г. № 413-З, артыкулы 101–102) [5].

Рэсурс ўяўляе сабой публічную (карыстальніцкую) частку і адміністратарскую. Для карыстальнікаў будзе магчыма звярнуцца да наступнай інфармацыі, якая з’яўляецца агульнадаступнай:

- уліковыя дадзеныя;
- даведачная інфармацыя (назва, дата стварэння, кароткае апісанне і інш.);
- месцазнаходжанне, карта, каардынаты GPS;
- фотагалерэя;

Гэта адкрытая інфармацыя, якая прадстаўлена ў Дзяржаўным спісе, аднак падаецца яшчэ дадатковая інфармацыя: апісанне аб’екта, фотагалерэя,навіны па тэматыцы рэсурса.

З 2021 года Міністэрства культуры перадало паўнамоцтвы па вядзенні і фарміраванні Банка звестак Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі(далей – НББ) [10]. Спецыялістамі НББ быў прааналізаваны вопыт стварэння падобных рэсурсаў, распрацаваны тэхнічныя патрабаванні на мадэрнізацыю і ў 2022 г. быў створаны новы сайт на прынцыпе калектыўнага напаўнення: звесткі ўносяць рэгіянальныя спецыялісты, а мадэрацыю ажыццяўляюць спецыялісты НББ. Кожны аб'ект ГКК прадстаўлены ў Банку звестак у форме структураванага электроннага пашпарта. На сёняшні дзень публічная частка сайта heritage.gov.by даступна ўсім карыстальнікам інтэрнэту і ўтрымлівае пошукавы фільтр, інтэрактыўную мапу і навіны. Загадам Міністэрства Культуры РБ № 99 ад 09.06.2025 г. вызначана, што з 1 студзеня 2026 г. НББ упаўнаважана прадастаўляць доступ да карыстання рэсурсамі Банка звестак усім катэгорыям карыстальнікаў (фізічным асобам, юрыдычным асобам, ІП) на падставе запыту праз пісьмовы зварот у Міністэрства культуры, ці адмысловую электронную форму на сайце Банка звестак. Рашэнне аб доступе, аб’ёме, ці адмове ў доступе прымаецца Міністэрствам культуры [9].

Кожная ГКК у Банку звестак прадстаўлена электронным пашпартам, палі і раздзелы якога адпавядаюць папяровай версіі пашпарта ГКК. Для аб'ектаў архітэктуры, у тым ліку для ратуш, найбольш змястоўным і складаным з'яўляецца раздзел «Апісанне», у якім фіксуюцца ўласцівасці будынка як помніка дойлідства, гісторыя і абставіны яго стварэння. Для аб'ектаў архітэктуры фіксуюцца: стыль, кампазіцыя і планіровачная схема (прамавугольны ў плане, цэнтрычны і інш.); характарыстыка аб'ёмна-прасторавага рашэння (колькасць паверхаў, вежа, купал, шпіль, дах); дэкор фасадаў (пілястры, карнізы, аконныя аздобы, рустоўка); унутранае планаванне і інтэр'ер; матэрыялы (цэгла, тынкоўка); прыём кампазіцыі (сіметрыя, рызаліт, акцэнт вежай).

Ратушы – найбольш прадстаўнічы тып помнікаў грамадзянскай архітэктуры Беларусі эпохі магдэбургскага права (кан. XIV–XVIII стст.). Сем захаваных і адноўленых ратуш краіны адлюстроўваюць эвалюцыю ад рэнесансу да класіцызму і з'яўляюцца каштоўнымі аб'ектамі ўліку Банка звестак.

Ратуша (ад ням. Rathaus– «дом рады») – будынак гарадскога самакіравання, які ўзводзіўся ў горадзе, якому было нададзена магдэбургскае права. На Беларусі гэты тып з'явіўся ў XV ст. і атрымаў распаўсюджанне ў XVI–XVIII стст. Ратушы стаялі на галоўнай рыначнай плошчы, нярэдка ў складзе ансамбля з гандлёвымі радамі. Яны выконвалі шматлікія функцыі: паседжанні магістрата, суд, архіў, казна, захоўванне гарадскіх мер вагі і аб'ёму. Вежа з гадзіннікам і звонам была нязменным сімвалам гарадскіх свабод.

У архітэктурным плане беларускія ратушы эвалюцыянавалі ад рэнесансу і барока (Нясвіж XVI ст.; Мінск XVII–XVIII стст., СлонімXVIII ст.) да класіцызму (Чачэрск, Шклоў, Магілёў, XVIII ст.) і спалучэння стыляў (Віцебск, барока + класіцызм). Тыповая кампазіцыя – двухпавярховы прамавугольны корпус з выступаючай цэнтральнай вежай, завершанай купалам або шатровым дахам са шпілем.

З шасці ратуш, зарэгістраваных у Банку звестак, адна адноўлена з нуля на месцы знесеных гістарычных будынкаў (Мінск), а пяць захаваліся і прайшлі рэстаўрацыю або рэканструкцыю. Зводная характарыстыка прадстаўлена ў Табліцы 1.

*Табліца 1. Ратушы Беларусі: статус захавання, шыфры ГКК і сучаснае выкарыстанне*

| Назва | Шыфр | Дата / Стыль | Статус захавання | Сучаснае выкарыстанне |
|---|---|---|---|---|
| **Мінская ратуша** | 711Е000001 | 1499 / адн. 2002–03Класіцызм | **Адноўлена з нуля** | Зала прыёмаў Мінгарвыканкама; выставачныя залы; з 2012 г. адкрыта для наведвальнікаў |
| **Нясвіжская ратуша** | 611Г000474 | да 1596 / рэст. 1996–2004Рэнесанс / Барока | Захавалася; рэстаўрацыя | Уваходзіцьу склад«Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж»; турыстычны аб'ект. Вежа адноўлена па гравюры Макоўскага 1600–1604 гг. |
| **Віцебская ратуша** | 212Г000051 | 1775 (мур.) / надб. 1911 Барока + класіцызм | Захавалася; рэканструкцыя | Галоўны будынак Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (заснаваны 1918 г., у ратушы з 1925 г.) |
| **Чачэрская ратуша** | 311Г000805 | 2-я пал. XVIII ст. / адн. 2004 | Захавалася; рэстаўрацыя | Чачэрскі гісторыка-этнаграфічны музей (з 2004 г.). Пры пажары 1972г. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Класіцызм + псеўдаготыка | | страчаны драўляныя вежы і перакрыцці, адноўленыя ў ходзе рэстаўрацыі |
| **Шклоўская ратуша** | 512Г000565 | 1770–1772 / рэст. 1999 Класіцызм | Захавалася; рэстаўрацыя | Частка комплексу з гандлёвымі радамі: у гандлёвых радах — гімназія і гісторыка-краязнаўчы музей гімназіі |
| **Слонімская ратуша** | 412Г000510 | сяр. XVIII ст. Барока | Захавалася; рэканструкцыя | У будынку месціцца бібліятэка |
| **Магілёўская ратуша** | Не з'яўляецца ГКК | 1698 барока / зруйн. 1957 / адн. 2008 | **Адноўлена з нуля** | Музей гісторыі Магілёва (у будынку з 2008 г.) |

Дзве ратушы – Мінская і Магілёўская – з'яўляюцца поўнымі рэканструкцыямі, узведзенымі на гістарычных фундаментах паводле захаваных чарцяжоў і гравюр. Мінская ратуша была разабрана ў 1857 г. па загадзе Мікалая I і адноўлена ў 2002–2003 гг. архітэктарам С. Багласавым. Магілёўская ратуша, узведзеная ў 1698 г., была моцна пашкоджана ў Вялікую Айчынную вайну і падарваная ў 1957 г.; аднаўленне пачалося ў 1992 г. (закладка першага каменя), але рэальнае будаўніцтва вялося ў 2007–2008 гг. Абодва помніка сёння функцыянуюць як музейна-культурныя і адміністрацыйныя цэнтры.

Пяць астатніх ратуш дайшлі да нас у рознай ступені захаванасці і прайшлі рэстаўрацыю або рэканструкцыю. Найбольш комплекснай была рэстаўрацыя Чачэрскай ратушы: пажар 1972 г. знішчыў аўтэнтычныя драўляныя вежы і перакрыцці, якія былі адноўлены да 2004 г. У Нясвіжскай ратушы рэстаўрацыйныя работы вяліся ў перыяд 1997–2004 гг., у ходзе якіх

6-ярусная вежа з купалам адноўлена паводле гравюры Т. Макоўскага 1600–1604 гг. Віцебская і Шклоўская ратушы захаваліся ў асноўным аб'ёме, але перажылі перабудовы: Віцебская – надбудову 3-га паверха ў 1911 г., Шклоўская – рэстаўрацыю ў 1999 г.

Аналіз сучаснага функцыянальнага выкарыстання ратуш паказвае, што чатыры ратушы выкарыстоўваюцца пад музеі, а тры выконваюць адміністрацыйную або змешаную функцыю:

- Музеі: Нясвіжская (Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж»), Віцебская (Віцебскі абласны краязнаўчы музей, з 1925 г.), Чачэрская (гісторыка-этнаграфічны музей, з 2004 г.), Магілёўская (Музей гісторыі Магілёва, з 2008 г.);
- Змешанае адміністрацыйна-культурнае выкарыстанне: Мінская (зала прыёмаў Мінгарвыканкама + выставачная функцыя + экскурсіі), Шклоўская (гімназія і гісторыка-краязнаўчы музей гімназіі);
- Установа культуры: Слонімская ратуша (бібліятэка).

Такім чынам, большасць ратуш Беларусі выконваюць публічную культурна-асветніцкую функцыю, якая адпавядае іх першапачатковаму прызначэнню як цэнтраў грамадскага жыцця горада.

**Архітэктурная характарыстыка кожнай ратушы ў адпаведнасці з раздзелам «Апісанне» электроннага пашпарта Банка звестак, а таксама звесткі аб найбольш значных падзеях, якія звязаны з гэтымі будынкамі:**

**Гарадская ратуша з гандлёвымі радамі** (г. Нясвіж, шыфр 611Г000474; аб'ект міжнароднага значэння)

*Архітэктурнае апісанне.* Будынак ратушы з’яўляецца часткай комплекса «Гарадская ратуша з гандлёвымі радамі», размешчанага на плошчы ў цэнтры горада. Цагляны прамавугольны ў плане 2-павярховы будынак з падваламі, 3-скатным дахам і 6-яруснай вежай (4 ніжнія чацверыкі, 2 верхнія васьмерыкі) завершанай гранёным купалам з ліхтаром. На ўзроўні 5-га яруса вежы размешчаны невялікі балкон з кованай рашоткай, на ўзроўні 6 – гадзіннік,

цыферблаты якога арыентаваны на чатыры бакі. Узроўні ярусаў вежы і памяшканняў ратушы не супадаюць і злучаны драўлянымі сходамі. Бакавыя часткі галоўнага фасада завершаны трохвугольнымі шчытамі з акруглымі вокнамі. Сцены амаль пазбаўлены дэкору, прарэзаны прамавугольнымі ваконнымі праёмамі, завершаны тонкім прафіляваным карнізам. Праёмы верхніх ярусаў вежы і галоўнага ўваходу аздоблены каменнымі абрамленнямі, аконныя праёмы 1-га паверха – дэкаратыўнымі кратамі. З трох бакоў ратушу атачаюць гандлёвыя рады, арыентаваныя ўваходнымі праёмамі да плошчы і прылеглых вуліц. 1-схільныя дахі гандлёвых радоў накіраваны ў бок ратушы. Такім чынам увесь комплекс утварае П-падобны ўнутраны замкнёны дворык.

На першым паверсе ў «магдэбургскі перыяд» размяшчаліся гандлёвыя крамы, вагавая з гарадскім эталонам вагаў, склад зброі і пажарны інвентар; другі паверх займалі зала рады, кабінет войта, судовая зала, архіў, скарбніца. На верхнім ярусе ратушнай вежы з самага пачатку быў усталяваны гадзіннік. У падвале, пад вежай, знаходзілася гарадская турма, у якую можна было трапіць праз люк у падлозе першага паверха. Гандлёвыя рады мелі розную форму і памеры, па-рознаму размяшчаліся на плошчы: па перыметры рынку, у адзін ці некалькі радоў у цэнтры рынку, але часцей у комплексе з будынкам ратушы. У планіровачнай арганізацыі гандлёвых радоў абавязковым з'яўляўся прынцып сіметрычнай кампазіцыі – шматлікія паўторы адной і той жа ячэйкі-секцыі.

*Знакавыя падзеі.* Ратуша ўзведзена каля 1596 г. паводле прывілея М.К. Радзівіла Сіроткі – гараджане самі фінансавалі будаўніцтва ў абмен на вольнасці. Падчас Паўночнай вайны будынак гарэў і быў адбудаваны ў стылі позняга барока ў 1752 г. Пажар 1836 г. знішчыў вежу з шасці да чатырох ярусаў і гадзіннік. Рэстаўрацыя 1997–2004 гг. вярнула будынку першапачатковы сілуэт паводле гравюры Т.Макоўскага 1600–1604 гг. Сёння ратуша ўваходзіць у склад Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Нясвіж» і рэгулярна прымае ўрачыстыя мерапрыемствы, у тым

ліку святкаванні гарадскіх юбілеяў. У экспазіцыі гарадской ратушы прадстаўлена гісторыя гарадскога самакіравання і гандлёва-рамесніцкага жыцця Нясвіжа XVI – XIX стст. [1; 4].

**Будынак (г.Мінск**, шыфр 711Е000001 (711Е000001_1_47), аб'ект без катэгорыі, адноўлены з нуля)

*Архітэктурнае апісанне.* Будынак трохпавярховы з надбудаваным паверхам вежы. Да асноўнага прамавугольнага ў плане аб'ёму з боку тыльнага фасада прымыкае ніжэйшая прыбудова. Фасад прыбудовы раскрапаваны лапаткамі, вуглавыя часткі аформлены арачнымі нішамі, дэкарыраванымі вазамі і рустам, завершаны фрызавым поясам і карнізам. Асноўны аб'ём накрыты пакатым вальмавым дахам з люкарнамі. Фасадныя плоскасці вырашаны лаканічна, чляенены прамавугольнымі аконнымі і дзвярнымі праёмамі. Галоўны фасад вылучаны цэнтральным рызалітам з чатырохкалонным порцікам іанічнага ордэра. Порцік завершаны антаблементам і разарваным трохвугольным франтонам з арачным праёмам. На першым паверсе рызаліта прамавугольны дзвярны праём галоўнага ўвахода ў простай ліштве з замковым каменем. Па краях рызаліта высокія арачныя аконныя праёмы. На другім паверсе рызаліта адкрытая галерэя з балюстраднай агароджай. Фасад прарэзаны ў цэнтры прамавугольным аконным праёмам, акцэнтаваным прысценным двухкалонным порцікам з арачным завяршэннем. Па краях размешчаны арачныя нішы. Падобнымі значнага вынасу порцікамі іанічнага ордэра з галерэяй на другім паверсе аформлены тарцовыя фасады асноўнага аб'ёму ратушы. Фасады завершаны антаблементам і карнізам з мадульёнамі. Над рызалітам на галоўны фасадзе ўзвышаецца чацверыковая вежа, завершаная пакатым вальмавым дахам са шпілем і флюгерам. Вуглы вежы аформлены лапаткамі. Карнізнымі паясамі вежа падзелена на тры невысокія ярусы. Фасады ніжняга яруса прарэзаны арачнымі аконнымі і дзвярным праёмамі, над якімі ў другім радзе змешчаны меншыя арачныя аконныя праёмы. Галоўны фасад упрыгожвае герб Мінска. Па перыметры ніжняга яруса вежы праходзіць адкрытая галерэя з

балюстраднай агароджай. Галерэя абапёрта на дэкаратыўныя кранштэйны. У другім ярусе вежы змешчаны гадзіннікі. Трэці ярус вежы члянёны скругленымі люкарнамі.

*Знакавыя падзеі.* Першая мінская ратуша ўзнікла пасля атрымання горадам Магдэбургскага права ў 1499 г. і валодала першым гарадскім гадзіннікам. У 1857 г. знесена паводле асабістай рэзалюцыі Мікалая І як сімвал гарадскіх вольнасцей. У 2002-2003 гг. ратуша адноўлена па праекце С. Багласава на гістарычным месцы, вызначаным у выніку археалагічных даследаванняў. У 2004 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё адноўленага будынка. У будынку ратушы на другім паверсе, дзе раней размяшчаўся магістрат, – зала ўрачыстых прыёмаў Мінгарвыканкама. На першым паверсе – выставачныя залы. З 2012 г. ратуша адчынена для наведвальнікаў. У 2014 г. каля ратушы ўсталявана скульптура «Гарадскі войт» (С. Аганаў, С. Багласаў). Дзейнічаюць дзве доўгатэрміновыя экспазіцыі: «Мінск у гістарычнай прасторы, «Картаграфічны кабінет» і «Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі» [1; 6; 8].

**Ратуша (г. Віцебск** шыфр 212Г000051, аб'ект нацыянальнага значэння)

*Архітэктурнае апісанне.* Будынак у плане мае форму прамавугольніка. У архітэктуры сумяшчаюцца рысы позняга барока і класіцызму. У аснову аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі пакладзены прынцып кантраснага супастаўлення аб'ёмаў прыземістага корпуса і шмат'яруснай вежы. Па цэнтру будынка размешчана лесвіца, па абодвух баках якой знаходзяцца асноўныя памяшканні. Першапачаткова вежа была завершана высокім шатром са шпілем, цяпер – вежычкай-павільёнам з глядзельнай пляцоўкай. Ярусы вежы аздоблены пілястрамі, валютамі, раскрапаванымі карнізамі; на верхнім ярусе - гадзіннік. Асноўны корпус у архітэктурных адносінах вырашаны больш проста: плоскасць галоўнага фасада члянёная прамавугольнымі аконнымі праёмамі на першым паверсе і паўцыркульнымі на другім і трэцім. Дэкаратыўныя элементы вырашаны ў стылі барока (раскрапаваныя вуглы з крывалінейнымі контурамі, дэкаратыўныя валюты, складанапрафіляваныя

карнізы) у асноўным сканцэнтраваны на 4-вугольнай у плане вежы. Першапачаткова сцены ратушы былі пафарбаваныя вапнавым растворам з дабаўленнем віцебскай гліны і мелі залаціста-вохрысты колер, а асноўныя архітэктурныя дэталі – пілястры, карнізы, наліčнікі былі пафарбаваныя белым вапнавым растворам. У будынку знаходзіліся грамадскія ўстановы. У канцы XVIII ст. тут знаходзіліся паліцыя, галоўны суд, другі дэпартамент, гаўпвахта, пажарны двор; у XIX ст. – гарадская дума.

*Знакавыя падзеі.* Першая драўляная ратуша на Узгорскім пасадзе ўзведзена пасля атрымання Магдэбургскага права ў 1597 г.; знесена ў 1624 г. пасля паўстання гараджан. Мураваная ратуша ўзведзена ў 1775 г. У 1833 г. быў зменены верх вежы: замест высокага шпілю ўстаноўлена назіральная пляцоўка з невялікай ратондай. У 1873-1875 гг. зроблены ўнутранныя перабудовы ў сувязі з перамяшчэннем на другі паверх гарадской думы, а на першы - паліцэйскага ўпраўлення. У 1910 г. гарадской управе было дазволена надбудаваць трэці паверх, што і было зроблена ў 1911 г. па праекце архітэктара Т.В. Кібардзіна. У Вялікую Айчынную вайну была пашкоджана верхняя частка вежы з гадзіннікам, у сценах меліся прабоіны. У 1946-1947 гг. гадзіннік аднавіў народны майстар С. Юшкоўскі. У XX ст. у будынку неаднаразова праводзіліся рэстаўрацыйныя работы (1913, 1944, 1970-я). У 1980-я гады паўночная частка будынка ратушы была разабрана і адбудавана зноў, унутраны дворык быў забудаваны і стаў часткай будынка. Фрагментарна ўскрыта арыгінальная цагельная кладка. У 1997 годзе, у сувязі з 400-годдзем ратушы, на галоўным фасадзе будынка быў усталяваны двухметровы герб Віцебска, выкананы з бронзы віцебскім скульптарам В. Магучым. Але ў пачатку XXI ст. пасля чарговага капітальнага рамонту ён быў зняты з фасада і перамясціўся на вуліцу перад галоўным уваходам у ратушу. У 2003 годзе адкрыта аглядная пляцоўка. Яна вузкая, абгароджана невысокай балюстрадай. У будынку былой ратушы з 4 лістапада 1924 года размяшчаецца краязнаўчы музей (зараз УК «Віцебскі абласны краязнаўчы музей») [1; 2; 3].

**Ратуша (г. Чачэрск** шыфр 311Г000805, аб'ект міжнароднага значэння)

*Архітэктурнае апісанне.* Будаўніцтва ратушы было распачата ў 1780-я гг. з загаду графа Захара Рыгоравіча Чарнышова. Раней на будынку быў вялікі гадзіннік з боем, а наверсе стаяў вартаўнік, які паведамляў аб прыездзе гасцей. Зубцы на вежах сімвалізуюць тое, што горад не раз наведвалі царскія асобы. Мураваны двухпавярховы квадратны ў плане цэнтрычны аб'ём, завершаны 5 драўлянымі чацверыковымі вежамі. Чатыры з іх, размешчаныя па вуглах будынка, увенчаны шпілямі. Пятая цэнтральная вежа больш высокая і звужаная на масіўным чацверыковым барабане завершана "каронай зубцоў". Вуглы будынка акцэнтаваны рызалітамі. Фасадныя плоскасці чляйёны прамавугольнымі і спічастымі вокнамі, размешчанымі ў неглыбокіх нішах. Па перыметры будынка праходзіць карніз з фігурнымі кранштэйнамі. Да 2 уваходаў па баках галоўнага фасада вядуць манументальныя каменныя лесвіцы. 1-ы і 2-гі паверхі сіметрычнай планіроўкі.

Архітэктура ратушы незвычайная і адрозніваецца ад традыцыйных мастацкіх нормаў канца XVIII ст., помнік архітэктуры класіцызму з элементамі псеўдаготыкі. Разам з класічнымі дэталямі тут ўжываюцца стральчатыя аркі, нішы, запазычаныя з арсенала гатычнага дойлідства.

*Знакавыя падзеі.* Ратуша ўзведзена ў другой палове XVIII ст. паводле замовы генерал-губернатара графа Захара Чарнышова, якому Кацярына II падарыла Чачэрск у 1774 г. за ваенныя заслугі. У 1972 г. моцны пажар знішчыў аўтэнтычныя драўляныя вежы і перакрыцці. Пасля рэстаўрацыі ў будынку ратушы месціцца дзяржаўная ўстанова культуры «Чачэрскі гісторыка-этнаграфічны музей». У экспазіцыях прадстаўлены археалагічныя знаходкі, прадметы сялянскага побыту, старажытныя абразы і вырабы мясцовых рамеснікаў. Ратуша з'яўляецца галоўнай турыстычнай славутасцю Чачэрска і месцам правядзення раённых культурных і навуковых мерапрыемстваў [1].

**Ратуша (г. Шклоў** шыфр 512Г000565; аб'ект нацыянальнага значэння)

*Архітэктурнае апісанне.* Пабудавана ратуша з цэглы ў XVIII стагоддзі, ў

стылі класіцызму. Будынак ратушы (захаваўся) быў злучаны з аднапавярховымі гандлёвымі радамі (не захаваліся), што стварала замкнёную кампазіцыю з вялікім унутраным дваром. Ратуша – прамавугольны ў плане двухпавярховы аб’ём з васьміграннай двух’яруснай вежай, якая ўзвышалася над цэнтральнай часткай будынка. Вежа была завершана пакатым гранёным купалам са шпілем. На шпіле выкаваны герб горада Шклова «Бязмен». Сцены прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі і расчлянёны пілястрамі. У першым паверсе зроблены скразны праезд, абапал якога размяшчаліся дапаможныя службы. Вуглавая двухмаршавая лесвіца вяла на другі паверх, дзе былі асноўныя службовыя памяшканні, згрупаваныя па баках кароткага калідора.

Прадаўгаватыя карпусы гандлёвых радоў складаліся з невялікіх памяшканняў з крыжовымі скляпеннямі. У цэнтры падоўжаных бакоў гандлёвых радоў меліся праезды. Крамы былі арыентаваны на двор і на вуліцу, што дазваляла максімальна выкарыстоўваць гандлёвую плошчу. Архітэктура іх вызначалася прастатой і рытмічнасцю. Вуглавыя часткі ансамбля былі вылучаны двухпавярховымі рызалітамі з шатровымі завяршэннямі. На вежы ратушы знаходзіўсягадзіннік з боем, звон якога было чуваць на 8-10 вёрст ад Шклова. Гандлёвыя рады адбудаваны наноў ў 2000 г. Ратуша мае падвал.Шклоўская ратуша, адзіная ў Беларусі, захаваная ў комплексе з гандлёвымі радамі.

*Знакавыя падзеі.* Ратуша пабудавана ў 1770–1772 гг. у складзе новага гарадскога цэнтра, узведзенага пасля разбуральнага пажару 1769 г. паводле рашэння ўладальніка Шклова князя Чартарыйскага. У 1999 г. ратуша адрэстаўравана; на вежы ўсталяваны гадзіннік і герб горада. Гандлёвыя рады адбудаванынаноў з гістарычнай дакладнасцю і ў комплексе размясцілася гімназія горада Шклова. У ратушы на другім паверсе размешчаны гісторыка-краязнаўчы музей гімназіі. Гэта адзін з рэдкіх прыкладаў выкарыстання гістарычнага гандлёвага комплексу пад адукацыйную функцыю. Шклоўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей, будынак якога размешчаны побач з

ратушай, прымае экскурсіі звязаныя з гісторыяй горада і ратушнага комплексу. Шклоўская ратуша ўнесена ў каталаг ратуш эпохі класіцызму, выдадзены ў ЗША [1].

**Будынак былой ратушы (г. Слонім**, шыфр 412Г000510; аб'ект нацыянальнага значэння)

*Архітэктурнае апісанне.* Сярод гістарычнай забудовы горада Слоніма на скрыжаванні вуліцы Савецкай і Першамайскай захаваўся будынак былой ратушы, пабудаванай у XVIII ст. Гэта каменны 2-павярховы будынак, які раней быў аформлены чатырохкалонным порцікам са скульптурнай застаўкай на франтоне. Яе архітэктурна-планіровачнай кампазіцыі ўласцівы сіметрычнасць, выразнасць, простыя і манументальныя формы. Дваровы фасад да цяперашняга часу захаваў дэкарацыю ў выглядзе пілястр, якія адносяцца да XVIII ст. Па перыметры будынка праходзіць карніз. Унутраная планіроўка калідорна-анфіладная з вестыбюлем і міжпаверхавай лесвіцай у цэнтры. З’яўляецца помнікам архітэктуры барока. Сёння будынак былой ратушы займае Слонімская раённая бібліятэка імя Я.Коласа.

*Знакавыя падзеі.* Слонім атрымаў Магдэбургскае права ў XVI ст. У сярэдзіне XVIII ст. горад быў важным культурным цэнтрам: кн. Міхал Казімір Агінскі ўтрымліваў тут адзін з лепшых у Рэчы Паспалітай прыватных оперных тэатраў. Ратуша як цэнтр гарадскога самакіравання ўваходзіла ў гэтае культурнае асяроддзе. Захаванасць пілястраў дваровага фасада XVIII ст. сведчыць аб пераемнасці архітэктурнага аблічча нягледзячы на пазнейшыя перабудовы [1].

**Магілёўская ратуша – не з’яўляецца ГКК, не ўнесена ў Банк звестак** (размешчана на тэрыторыі гістарычнага цэнтра г. Магілёва шыфр 512Е000001, адноўлена з нуля)

*Архітэктурнае апісанне*. Першая драўляная Ратуша была пабудавана яшчэ ў 1578 г.пасля прысваення гораду Магдэбургскага права. Драўляныя пабудовы неаднаразова гарэлі. Каменная Ратуша была ўзведзена ў 1698 у

стылі барока. Будынак быў крыты дахоўкай, меў 2 ганкі (вялікі і малы), над якімі размяшчаліся пазалочаныя флюгеры (ветрагонкі). Вышыня 8-граннай 5-яруснай вежы са шпілем была роўная 46 метрам.

У 1773 г. ратуша была рэканструявана і ў такім выглядзе стаяла да Вялікай Айчыннай вайны. У гады вайны была пашкоджана. Адноўлена ў 2008 годзе. Цяпер тут знаходзіцца Музей гісторыі горада Магілёва. Мураваны двухпавярховы будынак прамавугольны ў плане з васьмiграннай пяціярусавай вежай пасярэдзіне галоўнага фасада. Вышыня ратушы – 14 м, вежы — 47,3 м. Фасады адноўлены па схемах і малюнках былой ратушы. Выгляд новага будынку цалкам адпавядае абліччу сярэдзіны XVIII ст.: шырокі гарызантальны пояс падзяляе паверхі, рустоўка першага паверха, ліштвы вокнаў другога паверха. Дах стромкі, накрыты плоскай чырвонай дахоўкай; на франтоне, дахах ганкаў і шпілі – пазалочаныя флюгеры-ветракі. На вежы – балкон, вялікі гадзіннік. Унутраная планіроўка гістарычнай ратушы ўключала на першым паверсе «сені», залу суда войта, канцылярыю і пісарскі пакой; на другім – залу паседжанняў магістрата і судовую ізбу бурмістра; у цокольным паверсе – скарбніцу, сховішчы і турму; у вежы – залу і светліцу. Усе памяшканні ацяпляліся кафлянымі печамі з тэракотавай і паліванай кафляй зялёнага колеру.

*Знакавыя падзеі.* Першы камень у падмурак мураванай ратушы ўрачыста закладзены 4 верасня 1679 г. майстрам Феськай. У 1661 г. перазвон ратушнай вежы стаў сігналам да пачатку Магілёўскага паўстання – маскоўскі гарнізон быў амаль цалкам знішчаны, і па заканчэнні вайны Магілёў атрымаў правы, роўныя Вільні. У 1780 г. з назіральнай пляцоўкі вежы любавалася горадам Кацярына II разам з аўстрыйскім імператарам Іосіфам II. У 1915 г., падчас знаходжання ў Магілёве Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага, у вежы размяшчалася імператарская радыёстанцыя. Будынак ратушы быў моцна пашкоджаны ў час Вялікай Айчыннай вайны.Ратушу планавалася аднавіць, але ў 1957 г. яна была ўзарваная. У 1980-х гадах былі праведзены археалагічныя раскопкі на месцы знаходжання ратушы. Урачыстае адкрыццё

адноўленага будынку ратушы адбылося ў 2008 г. На вежы ратушы размешчаны механічны гадзіннік распрацоўкі магілёўскага інжынера Генадзя Галоўчыка. У 2014 г. на фасадзе з'явілася механічная постаць трубача «Магіслава» (імя абрана шляхам галасавання жыхароў). Сёння ў будынку дзейнічае Музей гісторыі горада Магілёва з пастаяннымі і часовымі экспазіцыямі. На 1-ым паверсе будынка прадугледжана размяшчэнне экспазіцыйных памяшканняў музея. На 2-ым паверсе – зала пасяджэнняў гарсавета, рабочыя кабінеты, падсобныя памяшканні. У мансардным паверсе – службовыя памяшканні музея. Зараз гэты аб’ект знаходзіцца ў спісе рэкамендуемых да надання статуса ГКК [1; 7; 11].

Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь прайшоў шлях ад ізаляванай базы дадзеных на адным ПК да сучаснага адкрытага вэб-рэсурсу з апісаннем аб'ектаў ГКК. На сёння Банк звестак утрымлівае аб’екты матэрыяльнай і нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны,колькасць якіх пастаянна расце і адпаведная інфармацыя папаўняе Банк звестак. Электронны пашпарт – асноўны дакументуліку кожнай ГКК. Яго раздзелы даюць цэласнае ўяўленне пра аб’ект ГКК. Сем ратуш Беларусі – важны пласт гісторыі гарадскога самакіравання XV–XVIII стст. 6 з іх прадстаўлены ў Банку звестак з рознай ступенню паўнаты. Сістэматычнае выкарыстанне Банка звестак дазваляе весці ўлік, маніторынг стану і папулярызацыю помнікаў беларускага дойлідства.

## Спіс крыніц

1. Банк звестак аб гісторыка-культурнай спадчыне Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http//heritage.gov.by/ (дата обращения: 12.03.2026).

2. Витебский областной краеведческий музей [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://ratusha-vit.by/ (дата обращения: 13.03.2026).

3. Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://pridvinie.vlib.by/ (дата обращения: 12.03.2026).

4. Дзяржаўная ўстанова «Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://niasvizh.museum.by/ (дата обращения: 12.03.2026).

5. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : 20 ліп. 2016 г. № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. : у рэд. Закона Рэсп. Беларусь ад 21 ліп. 2022 г. № 201-З // ЭТАЛОН : информ.-поисковая система (дата обращения: 13.03.2026).

